**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**Філалагічны факультэт**

**Кафедра сучаснай беларускай мовы**

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях:**
**1-21 05 01 “Беларуская філалогія (па напрамках)”,**
**1-21 05 02 “Руская філалогія (па напрамках)”,**
**1-21 05 04 “Славянская філалогія”,**
**1-21 05 05 “Класічная філалогія”,**
**1-21 05 06 “Рамана-германская філалогія”**

**ЗАЦВЕРДЖАНА**
Першы намеснік
Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
**“13” ліпеня 2010 г.**
**Рэгістрацыйны №**
**ТД-Д.133/тып.**

**Мінск**
**2010**

УДК 883.207 (07)
ББК 81.2 Беи-923
С89

**Складальнікі:**

**З. І. Бадзевіч,** загадчык кафедры сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

**С. А. Важнік,** дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

**Г. К. Чахоўскі,** дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**Рэцэнзенты:**

Кафедра беларускага мовазнаўства Установы адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна";

**А. А. Лукашанец**, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар.

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой праграмы:**

кафедрай сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, пратакол № 8 ад 28 красавіка 2010 г.;

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, пратакол № 4 ад 12 мая 2010 г.;

Навукова-метадычным саветам па філалагічных спецыяльнасцях Вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі, пратакол № 5 ад 27 мая 2010 г.;

Вучэбна-метадычнай камісіяй філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, пратакол № 9 ад 26 мая 2010 г.

Адказны за рэдакцыю: *З. І. Бадзевіч*

С89 **Сучасная** беларуская мова: тыпавая вучэб. праграма для вышэйш. навучальных устаноў па спец. 1-21 05 01 "Беларуская філалогія" (па напрамках), 1-21 05 02 "Руская філалогія" (па напрамках), 1-21 05 04 "Славянская філалогія", 1-21 05 05 "Класічная філалогія", 1-21 05 06 "Рамана-германская філалогія" / склад. З. І. Бадзевіч, С. А. Важнік, Г. К. Чахоўскі. – Мінск: БДУ, 2010. – 50 с.

У тыпавой вучэбнай праграме "Сучасная беларуская мова" вызначаны змест і аб'ём ведаў, якімі неабходна авалодаць студэнтам пры вывучэнні курса, а таксама акрэслена кола нарматыўных крыніц.

**УДК 883.207 (07)**
**ББК 81.2 Беи-923**

© БДУ, 2010

# Тлумачальная запіска

Тыпавая праграма па дысцыпліне “Сучасная беларуская мова” складзена на аснове Адукацыйных стандартаў па спецыяльнасцях 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках), 1-21 05 02 Руская філалогія (па напрамках), 1-21 05 04 Славянская філалогія (па напрамках), 1-21 05 05 Класічная філалогія (па напрамках), 1-21 05 06 Рамана-германская філалогія (па напрамках).

*Мэта* дысцыпліны “Сучасная беларуская мова” – фарміраванне прафесійнай лінгвістычнай кампетэнцыі будучых настаўнікаў-філолагаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў, каледжаў, работнікаў асветы, культуры, друку, навукова-даследчых устаноў.

*Задачы* дысцыпліны:

- вытлумачэнне з’яў беларускай мовы ў структурна-семантычным і функцыянальна-камунікатыўным аспектах;
- выяўленне адметных спецыфічных заканамернасцей, якія праяўляюцца на розных узроўнях беларускай мовы;
- вывучэнне беларускай мовы як жывой і рухомай з’явы;
- усведамленне дынамікі беларускай мовы і асноўных тэндэнцый яе развіцця;
- павышэнне арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці;
- набыццё устойлівых навыкаў самастойнага аналізу лінгвістычных фактаў і з’яў;
- удасканальванне сістэмы звязнага маўлення.

Метадалагічная база дысцыпліны мае на мэце правільную і навукова абгрунтаваную прэзентацыю звестак тэарэтычнага характару, скарэктаваную з улікам ідыяэтнічнага нацыянальнага кампанента беларускай мовы, характару і форм яе сувязей з іншымі мовамі, найперш роднаснымі славянскімі.

На лекцыйных і практычных занятках студэнты набываюць, засвойваюць і паглыбляюць веды па фанетыцы, фаналогіі, арфаэпіі, арфаграфіі, графіцы, лексікалогіі, фразеалогіі, марфеміцы, словаўтварэнні, марфалогіі і сінтаксісе сучаснай беларускай мовы ў такой ступені, каб усведамляць яе як грамадскую з’яву і пэўную семіятычную сістэму і дасканала валодаць яе сродкамі.

Вывучэнне дысцыпліны “Сучасная беларуская мова” павінна адбывацца ў цеснай сувязі з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі: “Гісторыя беларускай мовы”, “Беларуская дыялекталогія”, “Уводзіны ў мовазнаўства”, “Агульнае мовазнаўства”, “Сучасная руская мова”.

Выкарыстоўваючы прынцып пераемнасці і ўзаемасувязі лінгвістычных дысцыплін, выкладчык павінен адбіраць такія факты і з’явы, якія ўсталяваліся ў навуцы аб мове, лічацца стрыжнёвымі для разумення іншых пытанняў і з’яўляюцца важнымі для пашырэння агульнага моўнага дыяпазону студэнтаў. Метады і прыёмы выкладання матэрыялу могуць быць розныя (слова выкладчыка, гутарка, аналіз моўных фактаў, практыкаванні, праца з тэкстам, выкарыстанне сродкаў нагляднасці і іншыя): яны, як правіла, залежаць ад складанасці тэмы і ступені падрыхтаванасці студэнтаў. Пэўную ўвагу неабходна звяртаць на тыя пытанні, якія адносяцца да дыскусійных або ўносяць новае ў асвятленне асобных фактаў мовы, каб у студэнтаў не стваралася ўражанне, быццам у мовазнаўстве ўсе праблемы вырашаны.

Значная колькасць гадзін адводзіцца вучэбным планам на практычныя заняткі. Яны праводзяцца па тэмах, якія вызначаюцца выкладчыкам і зацвярджаюцца на кафедры. Іх мэта – замацаваць і паглыбіць тэарэтычныя веды. Методыка правядзення практычных заняткаў розная: індывідуальнае, франтальнае, паслядоўна-лінейнае або выбарачнае апытванне; выкананне практыкаванняў на дошцы; работа па гатовых табліцах і схемах; выкананне тэставых заданняў і тэстаў на камп’ютарах, праслухоўванне і аналіз разнастайных лінгвістычных запісаў і г.д. Правільна арганізаваная сістэма практычных заняткаў спрыяе выпрацоўцы ў студэнтаў самастойных навуковых поглядаў на моўныя з’явы і працэсы, дапамагае ім грунтоўна авалодаць нормамі літаратурнай мовы, паскарае набыццё навыкаў самастойнага аналізу моўных з’яў і фактаў .

Важнае значэнне ў працэсе засваення і замацавання ведаў і навыкаў мае лінгвістычны аналіз розных моўных адзінак – гукаў, слоў, фразем, словазлучэнняў і сказаў. Для таго, каб лінгвістычны аналіз стаў сапраўдным эфектыўным навучальным сродкам, выкладчык павінен зыходзіць з адзіных навукова-метадычных прынцыпаў, сістэмнасці і строгай паслядоўнасці тлумачэння моўных з’яў. У залежнасці ад задач, якія ставяцца ў кожным канкрэтным выпадку, лінгвістычны аналіз можа быць вусным ці пісьмовым, частковым ці поўным.

Усе віды лінгвістычнага аналізу (фанетычны, графічны, арфаграфічны, лексічны, фразеалагічны, этымалагічны, марфемны, словаўтваральны, марфалагічны, сінтаксічны і лінгвістычны аналіз тэксту) праводзяцца пры вывучэнні адпаведнага раздзела курса.

У выніку вывучэння курса сучаснай беларускай мовы студэнты павінны *ведаць*:

- тыпалагічную і генетычную характарыстыку нацыянальнай беларускай мовы;
- структуру сучаснай беларускай мовы і яе функцыі;
- функцыянальныя стылі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
- сістэму літаратурных нормаў беларускай мовы;
- асноўныя паняцці структуры мовы;
- умовы і формы маўленчай камунікацыі.

Павінны *ўмець*:

- валодаць вуснай і пісьмовай разнавіднасцямі беларускай літаратурнай мовы;
- карыстацца моўнымі паняццямі і тэрмінамі ў іх сістэмна-структурных сувязях;
- валодаць маўленчай дзейнасцю ў сістэме стылёва-функцыянальных разнавіднасцей беларускай літаратурнай мовы;
- выяўляць і аналізаваць неабходныя моўныя адзінкі і моўна-выяўленчыя сродкі ў мастацкіх тэкстах;
- карыстацца асноўнымі метадамі лінгвістычнага аналізу;
- карыстацца навуковай, даведачнай і метадычнай літаратурай па беларускаму мовазнаўству.

Спіс рэкамендаванай літаратуры, які змешчаны ў канцы праграмы, уключае найбольш важныя працы як па ўсім вучэбным курсе, так і па асобных раздзелах. Аднак пры вывучэнні той або іншай тэмы выкладчык павінен рэгулярна знаёміць студэнтаў з лінгвістычнымі навінкамі, з навукова-тэарэтычнай і метадычнай літаратурай (манаграфіямі, зборнікамі навуковых прац, артыкуламі). Гэта патрабуе ад студэнтаў сістэматычна сачыць за новай літаратурай, папаўняць уласную бібліятэку неабходнымі падручнікамі, дапаможнікамі і манаграфіямі.

Колькасць гадзін на лекцыйную і практычную часткі вучэбнай дысцыпліны “Сучасная беларуская мова” рэгламентуецца тыпавым вучэбным планам.

| **Спецыяльнасці** | **Усяго** | **Аўдытор-ныя** | **Лекцыі** | **Практыч-ныя заняткі** |
|---|---|---|---|---|
| 1-21 05 01 – «Беларуская філалогія» (па напрамках) | 1024 | 426 | 226 | 200 |
| 1-21 05 02 – «Руская філалогія» (па напрамках) | 306 | 170 | 76 | 94 |
| 1-21 05 04 – «Славянская філалогія» | 140 | 102 | 42 | 60 |
| 1-21 05 05 – «Класічная філалогія» | 230 | 102 | 42 | 60 |
| 1-21 05 06 – «Рамана-германская філалогія» | 196 | 102 | 46 | 56 |

## Прыкладны тэматычны план

## 1-21 05 01 “Беларуская філалогія (па напрамках)”

| **№ п/п** | **Назва тэмы** | **Колькасць гадзін** | |
|---|---|---|---|
| | | **лекцыі** | **практычныя заняткі** |
| **1** | **Уводзіны** | 4 | 4 |
| **2** | **Фанетыка** | 22 | 22 |
| **3** | **Фаналогія** | 12 | 8 |
| **4** | **Арфаэпія** | 10 | 8 |
| **5** | **Графіка** | 2 | 2 |
| **6** | **Арфаграфія** | 18 | 12 |
| **7** | **Лексікалогія** | 12 | 16 |
| **8** | **Лексікаграфія** | 2 | 2 |
| **9** | **Фразеалогія** | 4 | 8 |
| **10** | **Фразеаграфія** | 2 | 2 |
| **11** | **Марфеміка** | 14 | 14 |
| **12** | **Марфаналогія** | 4 | 4 |
| **13** | **Словаўтварэнне** | 12 | 10 |
| **14** | **Марфалогія** | 2 | 2 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Назоўнік | 10 | 4 |
| | Прыметнік | 8 | 4 |
| | Лічэбнік | 8 | 4 |
| | Займеннік | 4 | 2 |
| | Дзеяслоў. Дзеепрыметнік. Дзеепрыслоўе | 8 | 6 |
| | Прыслоўе. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Мадальныя словы | 6 | 4 |
| | Службовыя часціны мовы. Прыназоўнікі. Злучнікі. Звязкі | 4 | 2 |
| | Часціцы. Выклічнікі. Гукаперайманні | 4 | 2 |
| **15** | **Сінтаксіс** | 2 | 2 |
| | Словазлучэнне | 8 | 8 |
| | Сказ | 4 | 2 |
| | Просты сказ | 16 | 14 |
| | Складаны сказ | 14 | 14 |
| | Складанае сінтаксічнае цэлае (ССЦ) | 2 | 8 |
| | Тэкст | 4 | 4 |
| | Чужая мова | 2 | 2 |
| **16** | **Пунктуацыя** | 2 | 4 |
| | **УСЯГО** | **226** | **200** |

## 1-21 05 02 “Руская філалогія (па напрамках)”

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі |
| 1 | **Уводзіны** | 2 | |
| 2 | **Фанетыка** | 4 | 6 |
| 3 | **Фаналогія** | 2 | 2 |
| 4 | **Арфаэпія** | 2 | 4 |
| 5 | **Графіка** | 2 | |
| 6 | **Арфаграфія** | 2 | 4 |
| 7 | **Лексікалогія** | 4 | 6 |
| 8 | **Лексікаграфія** | 2 | 2 |
| 9 | **Фразеалогія** | 2 | 4 |
| 10 | **Фразеаграфія** | 2 | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **11** | **Марфеміка** | 2 | 2 |
| **12** | **Марфаналогія** | | 2 |
| **13** | **Словаўтварэнне** | 2 | 2 |
| **14** | **Марфалогія** | 2 | |
| | Назоўнік | 4 | 4 |
| | Прыметнік | 2 | 2 |
| | Лічэбнік | 2 | 2 |
| | Займеннік | 2 | 2 |
| | Дзеяслоў. Дзеепрыметнік. Дзеепрыслоўе | 4 | 6 |
| | Прыслоўе. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Мадальныя словы | 2 | 2 |
| | Службовыя часціны мовы. Прыназоўнікі. Злучнікі. Звязкі | 2 | 2 |
| | Часціцы. Выклічнікі. Гукаперайманні | | 2 |
| **15** | **Сінтаксіс** | 2 | |
| | Словазлучэнне | 2 | 6 |
| | Сказ | 2 | 2 |
| | Просты сказ | 6 | 12 |
| | Складаны сказ | 8 | 8 |
| | Складанае сінтаксічнае цэлае (ССЦ) | 2 | 4 |
| | Тэкст | 2 | |
| | Чужая мова | 2 | 2 |
| **16** | **Пунктуацыя** | 2 | 4 |
| | **УСЯГО** | **76** | **94** |

## 1-21 05 04 “Славянская філалогія”

| **№ п/п** | **Назва тэмы** | **Колькасць гадзін** | |
|---|---|---|---|
| | | **лекцыі** | **практычныя заняткі** |
| **1** | **Уводзіны** | 2 | |
| **2** | **Фанетыка** | 2 | 2 |
| **3** | **Фаналогія** | 2 | |
| **4** | **Арфаэпія** | 2 | 2 |
| **5** | **Графіка** | 2 | |
| **6** | **Арфаграфія** | 2 | 4 |
| **7** | **Лексікалогія** | 2 | 4 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **8** | **Лексікаграфія** | | 2 |
| **9** | **Фразеалогія** | 2 | 2 |
| **10** | **Фразеаграфія** | | 2 |
| **11** | **Марфеміка** | 2 | 4 |
| **12** | **Марфаналогія** | | 2 |
| **13** | **Словаўтварэнне** | 2 | 4 |
| **14** | **Марфалогія** | 2 | 2 |
| | Назоўнік | 2 | 4 |
| | Прыметнік | 2 | 2 |
| | Лічэбнік | 2 | 2 |
| | Займеннік | | 2 |
| | Дзеяслоў. Дзеепрыметнік. Дзеепрыслоўе | 2 | 2 |
| | Прыслоўе. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Мадальныя словы | 2 | 2 |
| | Службовыя часціны мовы. Прыназоўнікі. Злучнікі. Звязкі | | 2 |
| | Часціцы. Выклічнікі. Гукаперайманні | | 2 |
| **15** | **Сінтаксіс** | 2 | |
| | Словазлучэнне | | 2 |
| | Сказ | 2 | |
| | Просты сказ | 2 | 2 |
| | Складаны сказ | 2 | 2 |
| | Складанае сінтаксічнае цэлае (ССЦ) | | 2 |
| | Тэкст | 2 | |
| | Чужая мова | | 2 |
| **16** | **Пунктуацыя** | | 2 |
| | **УСЯГО** | **42** | **60** |

## 1-21 05 05 “Класічная філалогія”

| **№ п/п** | **Назва тэмы** | **Колькасць гадзін** | |
|---|---|---|---|
| | | **лекцыі** | **практычныя заняткі** |
| **1** | **Уводзіны** | 2 | |
| **2** | **Фанетыка** | 2 | 2 |
| **3** | **Фаналогія** | 2 | |
| **4** | **Арфаэпія** | 2 | 2 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **5** | **Графіка** | 2 | |
| **6** | **Арфаграфія** | 2 | 4 |
| **7** | **Лексікалогія** | 2 | 4 |
| **8** | **Лексікаграфія** | | 2 |
| **9** | **Фразеалогія** | 2 | 2 |
| **10** | **Фразеаграфія** | | 2 |
| **11** | **Марфеміка** | 2 | 4 |
| **12** | **Марфаналогія** | | 2 |
| **13** | **Словаўтварэнне** | 2 | 4 |
| **14** | **Марфалогія** | 2 | 2 |
| | Назоўнік | 2 | 4 |
| | Прыметнік | 2 | 2 |
| | Лічэбнік | 2 | 2 |
| | Займеннік | | 2 |
| | Дзеяслоў. Дзеепрыметнік. Дзеепрыслоўе | 2 | 2 |
| | Прыслоўе. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Мадальныя словы | 2 | 2 |
| | Службовыя часціны мовы. Прыназоўнікі. Злучнікі. Звязкі | | 2 |
| | Часціцы. Выклічнікі. Гукаперайманні | | 2 |
| **15** | **Сінтаксіс** | 2 | |
| | Словазлучэнне | | 2 |
| | Сказ | 2 | |
| | Просты сказ | 2 | 2 |
| | Складаны сказ | 2 | 2 |
| | Складанае сінтаксічнае цэлае (ССЦ) | | 2 |
| | Тэкст | 2 | |
| | Чужая мова | | 2 |
| **16** | **Пунктуацыя** | | 2 |
| | **УСЯГО** | **42** | **60** |

## 1-21 05 06 “Рамана-германская філалогія”

| **№ п/п** | **Назва тэмы** | **Колькасць гадзін** | |
|---|---|---|---|
| | | **лекцыі** | **практычныя заняткі** |
| **1** | **Уводзіны** | 2 | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **2** | **Фанетыка** | 4 | 2 |
| **3** | **Фаналогія** | 2 | |
| **4** | **Арфаэпія** | 2 | 2 |
| **5** | **Графіка** | | |
| **6** | **Арфаграфія** | 2 | 4 |
| **7** | **Лексікалогія** | 4 | 2 |
| **8** | **Лексікаграфія** | | 2 |
| **9** | **Фразеалогія** | 4 | 2 |
| **10** | **Фразеаграфія** | | |
| **11** | **Марфеміка** | 2 | |
| **12** | **Марфаналогія** | | |
| **13** | **Словаўтварэнне** | 2 | 2 |
| **14** | **Марфалогія** | 2 | |
| | Назоўнік | 2 | 2 |
| | Прыметнік | 2 | 2 |
| | Лічэбнік | 2 | 2 |
| | Займеннік | | 2 |
| | Дзеяслоў. Дзеепрыметнік. Дзеепрыслоўе | 4 | 2 |
| | Прыслоўе. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Мадальныя словы | 2 | 2 |
| | Службовыя часціны мовы. Прыназоўнікі. Злучнікі. Звязкі | 2 | |
| **15** | **Сінтаксіс** | 2 | |
| | Словазлучэнне | | 4 |
| | Сказ | 2 | |
| | Просты сказ | | 8 |
| | Складаны сказ | | 8 |
| | Складанае сінтаксічнае цэлае (ССЦ) | | 4 |
| | Тэкст | 2 | |
| | Чужая мова | | 2 |
| **16** | **Пунктуацыя** | | 2 |
| | **УСЯГО** | **46** | **56** |

# УВОДЗІНЫ

Беларуская мова як найважнейшы элемент нацыянальнай культуры, духоўны скарб нацыі.

Змест і суадносіны паняццяў: *мова этнасу*, *мова нацыі*, *дзяржаўная мова*, *родная мова*. Роля роднай мовы ў працэсе станаўлення асобы і ў развіцці цывілізацыі.

Мова як сродак камунікацыі і інструмент пазнання рэчаіснасці. Роля і месца беларускай мовы ў сучасным грамадстве.

Сацыяльна-функцыянальная дыферэнцыяцыя беларускай нацыянальнай мовы: літаратурная мова, тэрытарыяльныя дыялекты, сацыялекты, мова горада і інш.

Беларуская літаратурная мова, яе прыметы: наддыялектнасць, унармаванасць, кадыфікаванасць, поліфункцыянальнасць, стылявая разгалінаванасць, вусная і пісьмовая формы ўжывання, жанравая разнастайнасць, сістэмная ўстойлівасць і маўленчая зменлівасць. Літаратурныя нормы з пункту гледжання сінхроннай дынамікі. Размежаванне норм пісьмовай і вуснай мовы. Ступень тэрытарыяльнай варыятыўнасці літаратурнай нормы і моўная сітуацыя. Рэтраспектыўны характар кадыфікацыі ў дачыненні да нормы. Фарміраванне і эвалюцыя норм сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Кадыфікацыя літаратурнай нормы ў граматыках, даведніках і слоўніках. Тэндэнцыя набліжэння норм літаратурна-пісьмовай мовы да норм размоўнай мовы. Сістэма функцыянальных стыляў і падстыляў літаратурнай мовы. Пісьмовая і вусная формы рэалізацыі стыляў.

Беларуская мова сярод моў свету. Генетычная і тыпалагічная характарыстыка беларускай мовы. Канцэпцыі паходжання беларускай мовы. Асноўныя этапы станаўлення і развіцця беларускай літаратурнай мовы. Беларуская літаратурная мова і мова мастацкай літаратуры.

Сучасная беларуская літаратурная мова як прадмет вывучэння ў сярэдняй і вышэйшай школе. Метадалагічная база, навукова-тэарэтычныя кірункі, практычныя мэты, змест, аб'ём, паняційны апарат і тэрміналогія курса сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Крыніцы вывучэння сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

## ФАНЕТЫКА

Мова як сродак камунікацыі. Роля гукавога боку мовы ў працэсе камунікацыі.

Фанетыка як навука аб гукавым ладзе мовы.

Прадмет фанетыкі. Агульная і прыватная фанетыка, апісальная (дэскрыптыўная), параўнальная (кампаратыўная) і гістарычная фанетыка. Метады вывучэння гукавога ладу мовы. Сувязь фанетыкі з іншымі раздзеламі мовазнаўства.

Стан сучаснай беларускай фанетыкі. Агляд асноўных лінгвістычных прац у галіне фанетыкі сучаснай беларускай мовы (А. І. Падлужны, Л. Ц. Выгонная, Л. І. Сямешка, Т. В. Паплаўская, Т. М. Нікалаева, Ф. М. Янкоўскі, І. Р. Бурлыка, Г. В. Лосік, В. У. Мартынаў, П.В. Садоўскі і інш.).

Транскрыпцыя. Віды транскрыпцыі (фанетычная, інтанацыйная, фанематычная). Сістэма транскрыпцыйных знакаў.

Паняцце аб фанетычным чляненні моўнай плыні. Зыходныя прынцыпы арганізацыі і чляненне адзінак мовы і маўлення. Сінтагматычныя і парадыгматычныя адносіны ў фанетыцы.

Асноўныя фанетычныя адзінкі: гук, склад, фанетычнае слова, маўленчы такт (сінтагма), фраза, фонаабзац тэкст; націск, інтанацыя.

Гукі мовы. Аспекты вывучэння гукаў: артыкуляцыйны, акустычны, перцэптыўны, функцыянальны. Гук і фанема.

Артыкуляцыйны аспект вывучэння гукаў. Будова маўленчага апарату; актыўныя і пасіўныя органы маўлення. Асноўныя фазы артыкуляцыі. Артыкуляторныя (фізіялагічныя) метады даследавання гукаў.

Акустычны аспект вывучэння гукаў. Агульныя акустычныя ўласцівасці гукаў. Частата ваганняў галасавых звязак і вышыня гука. Сіла і гучнасць гука. Спектр гука і тэмбр. Фармантная структура гука. Асноўныя метады акустычнага аналізу гукаў.

Перцэптыўны аспект вывучэння гукаў. Універсальныя і спецыфічныя перцэптыўныя характарыстыкі гукаў. Асноўныя метады вывучэння ўспрымання гукаў.

Функцыянальны аспект вывучэння гукаў. Функцыі гукаў у мове. Гукавы сімвалізм. Гук і фанема.

Прынцыпы класіфікацыі гукаў. Зычныя і галосныя гукі. Паняцце аб ар-

тыкуляцыйнай і акустычнай класіфікацыях гукаў.

Артыкуляцыйная класіфікацыя зычных: падзел зычных на групы паводле ўдзелу голасу і шуму, месца і спосабу ўтварэння, адсутнасці ці наяўнасці дадатковай артыкуляцыі (палаталізацыі). Санорныя і шумныя, звонкія і глухія. Губныя (губна-губныя і губна-зубныя) і язычныя: пярэднеязычныя (зубныя і пярэднепаднябенныя), сярэднеязычныя (сярэднепаднябенныя), заднеязычныя (заднепаднябенныя). Змычныя (выбухныя), шчылінныя (фрыкатыўныя), змычна-шчылінныя (афрыкаты), змычна-праходныя. Цвёрдыя (парныя і няпарныя) і мяккія (парныя і няпарныя) зычныя.

Артыкуляцыйная класіфікацыя галосных гукаў. Галосныя лабіялізаваныя і нелабіялізаваныя. Галосныя верхняга, сярэдняга і ніжняга пад'ёму. Галосныя пярэдняга, сярэдняга і задняга рада.

Адметнасць артыкуляцыйнай базы беларускай мовы (агульная ненапружанасць органаў маўлення, высокі пад'ём языка, схільнасць да моцнай палаталізацыі адных гукаў і велярызацыі другіх).

Акустычная класіфікацыя гукаў. Асноўныя класы гукаў паводле акустычных прымет.

Склад як фанетычная адзінка. Суадносіны паміж складам і марфемай: даўжыня слова ў складах і марфемах, суадносіны паміж складам, фанемай і марфемай, суадносіны паміж складовымі і морфавымі межамі. Складамарфемная арганізацыя слова. Тэорыі складападзелу (склада): экспіраторная, санорная, тэорыя мускульнага напружання. Тыпы складоў: аднакампанентныя і шматкампанентныя, адкрытыя і закрытыя, прыкрытыя і непрыкрытыя. Структура беларускага склада (слабае прымыканне, тэндэнцыя да адкрытага і прыкрытага склада). Рухомасць складовай структуры слова.

Прасадычныя фанетычныя адзінкі (націск, інтанацыя, паўзы), іх роля ў арганізацыі моўнай плыні.

Акцэнтная структура слова. Фанетычная прырода націску. Сродкі суперсегментнай арганізацыі слова. Тыпы націску. Акустычныя характарыстыкі беларускага націску. Рознамясцовасць, рухомасць слоўнага націску. Асноўны і пабочны націск у складаных словах. Праклітыкі і энклітыкі. Функцыі слоўнага, тактавага, фразавага і лагічнага націску.

Акустычныя характарыстыкі інтанацыі. Фразаўтваральны патэнцыял інтанацыі. Лінгвістычная значнасць інтанацыі. Кампаненты інтанацыі.

Асноўныя функцыі інтанацыі: камунікатыўная, вылучальная, арганізавальная, эмацыянальная.

Фарміраванне інтанацыйных адзінак. Аб’яднанне канкрэтных інтанацыйных рэалізацый у адзінку. Дыферэнцыяльныя прыметы інтанацыйных адзінак. Асноўныя камунікатыўныя тыпы выказванняў: апавядальны, пытальны, клічны. Паняцце інтанацыйнай канструкцыі (ІК) і інтанацыйнай структуры. Асноўныя тыпы ІК у беларускай мове.

Фанетыка тэксту. Тэкст і фонаабзац. Змены гукаў у моўнай плыні. Паняцце сінтагматыкі і парадыгматыкі на фанетычным узроўні. Дыяхранічныя і сінхранічныя фанетычныя законы. Паняцце фанетычных працэсаў і фанетычных адносін. Асноўныя фанетычныя працэсы: асіміляцыя, дысіміляцыя, метатэза, сцяжэнне, падаўжэнне, пратэза, эпентэза, дыярэза, акамадацыя, рэдукцыя, гаплалогія.

Пазіцыйныя чаргаванні гукаў як вынік фанетычных працэсаў. Пазіцыйныя чаргаванні зычных гукаў: звонкіх і глухіх, цвёрдых і мяккіх, зубных (свісцячых) і пярэднепаднябенных (шыпячых), выбухных і афрыкат. Чаргаванні галосных у націскных і ненаціскных складах. Гістарычныя чаргаванні галосных і зычных гукаў.

## ФАНАЛОГІЯ

Фаналогія як раздзел мовазнаўства. Фанетычная і фаналагічная сістэмы сучаснай беларускай мовы. Дыстрыбуцыя фанем.

Лінгвістычная эвалюцыя паняцця “фанема”. Фанема ў трактоўцы Маскоўскай, Ленінградскай (Пецярбургскай) і Пражскай фаналагічных школ.

Сталыя і зменныя прыметы гукавых адзінак. Дыферэнцыяльныя і інтэгральныя прыметы фанем. Сігніфікатыўна і перцэптыўна моцныя і слабыя пазіцыі фанем. Асноўны алафон, варыянт і варыяцыя фанемы. Гіперфанема і архіфанема. Нейтралізацыя фанемных супрацьпастаўленняў.

Фаналагічная сістэма беларускай мовы. Паняцце аб фаналагічнай падсістэме запазычаных і рэдкаўжывальных слоў. Адметнасць фаналагічнай сістэмы беларускай мовы як мовы кансанантнага тыпу.

Сістэма зычных фанем у беларускай мове. Роля карэляцый у кансанантызме. Карэляцыі фанем па глухасці-звонкасці. Няпарныя фанемы па глухасці-звонкасці. Карэляцыя цвёрдых-мяккіх зычных. Няпарныя цвёрдыя (зацвярдзелыя) зычныя. Карэляцыя шыпячых-свісцячых. Карэляцыя

выбухных-афрыкат. Фаналагічны статус фанемы <j>. Фаналагічны статус падоўжаных (гемінатыўных) зычных.

Сістэма галосных фанем у беларускай мове. Гукавыя рэалізацыі галосных фанем у моцных (сігніфікатыўна і перцэптыўна) і слабых (сігніфікатыўна і перцэптыўна) пазіцыях. Формула акання.

Суадносіны паміж зычнымі і галоснымі фанемамі ў моцных і слабых пазіцыях. Функцыянальная значнасць фанем у моцных і слабых пазіцыях. Фанемныя і марфафанемныя рады.

Сінтагматычныя адносіны ў фанетыцы і фаналогіі. Спалучэнні зычных з наступнымі галоснымі гукамі (фанемамі). Спалучэнні зычных з наступнымі зычнымі гукамі (фанемамі). Абмежаванні ў парадыгматыцы галосных фанем, выкліканыя сінтагматыкай. Абмежаванні ў сінтагматыцы зычных фанем, выкліканыя парадыгматыкай.

## АРФАЭПІЯ

Прадмет і задачы арфаэпіі. Арфаэпія як правілы рэалізацыі фанетычнай сістэмы. Практычнае значэнне арфаэпіі.

З гісторыі фарміравання беларускага літаратурнага вымаўлення.

Асноўныя нормы сучаснага беларускага вымаўлення: вымаўленне націскных і ненаціскных галосных, вымаўленне зычных (у моцных і слабых пазіцыях). Правілы вымаўлення гукаў на стыку слоў. Вымаўленне гукаў у запазычаных словах.

Праблемы варыянтнасці на фанетычным узроўні. Арфаэпічная варыянтнасць у вакалізме і кансанантызме. Прычыны, характар і літаратурныя межы арфаэпічнай варыянтнасці ў беларускай мове.

Арфаэпічная норма і культура маўлення.

Адхіленні ад норм літаратурнага вымаўлення і іх прычыны.

Асноўныя тэндэнцыі развіцця арфаэпічнай нормы на сучасным этапе.

Даведнікі па беларускай арфаэпіі.

## ГРАФІКА

Прадмет і задачы графікі. Графічная сістэма сучаснай беларускай мовы. Літарныя графічныя сродкі. Алфавіт як аснова графікі. Нялітарныя графічныя сродкі: апостраф, злучок (дэфіс), націск, пунктуацыйныя знакі і інш. Гісторыя станаўлення беларускай графікі.

Суадносіны паміж літарамі (графемамі) і гукамі (фанемамі) у беларускай графіцы.

Складовы і гукавы прынцыпы беларускай графікі. Адназначныя і двухзначныя літары.

## АРФАГРАФІЯ

Арфаграфія, яе прадмет і задачы. Арфаграма і апорнае напісанне. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі: фанетычны, фанематычны (марфалагічны), традыцыйныя і дыферэнцыйныя напісанні.

Правілы правапісу галосных, заснаваныя на фанетычным прынцыпе. Правапіс зычных паводле фанетычнага прынцыпу.

Фанематычныя і традыцыйныя напісанні галосных.

Правілы правапісу зычных, заснаваныя на фанематычным прынцыпе.

Дыферэнцыйныя напісанні.

Прынцыпы і правілы напісання слоў злітна, асобна, праз злучок. Ужыванне вялікай літары.

Напісанне абрэвіятур і ўмоўных скарачэнняў. Правілы пераносу.

Гісторыя станаўлення беларускай арфаграфіі. Тэндэнцыя развіцця арфаграфічнай нормы на сучасным этапе.

Даведнікі па беларускай арфаграфіі.

## ЛЕКСІКАЛОГІЯ

Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Прадмет і задачы лексікалогіі. Семасіялогія і лексікалогія. Аспекты лексічнай семантыкі. Сема і семема. Інтэгральныя і дыферэнцыяльныя семы. Семантычная структура слова. Суадносіны семы і лексемы.

Сінтагматычныя і парадыгматычныя адносіны ў лексіцы. Шляхі фарміравання і развіцця лексічнага складу беларускай мовы.

Асноўны слоўнікавы склад беларускай мовы, яго колькасныя і якасныя параметры. Сістэмна-семасіялагічная характарыстыка лексічнага складу беларускай мовы. Адлюстраванне ў лексіцы ўніверсальных і спецыфічных кампанентаў нацыянальнай культуры і гісторыі.

Слова як асноўная адзінка мовы. Абагульняльны характар слова. Сэнсавая структура слова. Функцыі слова. Лексічнае і граматычнае значэнні слова, іх узаемаабумоўленасць. Дэнататыўнае, сігніфікатыўнае і ўнутрымоўнае значэнні слова. Канататыўны кампанент значэння слова.

Тыпы лексічных значэнняў у залежнасці ад адносін да прадметаў і з'яў рэчаіснасці (прамыя / пераносныя, канкрэтныя / абстрактныя); у залежнасці ад адносін да свядомасці (агульныя / тэрміналагічныя, эмацыянальныя / неэмацыянальныя); у залежнасці ад сувязей значэнняў паміж сабой у мове (матываваныя / нематываваныя, вытворныя / невытворныя); у залежнасці ад асаблівасцей рэалізацыі ў маўленні: свабодныя / звязаныя (фразеалагічна звязаныя і сінтаксічна абумоўленыя, канструкцыйна абмежаваныя).

Лексіка-стылістычная сінтагматыка. Значэнне слова і канкрэтнае ўжыванне слова.

Семантычная структура мнагазначнага слова. Сутнасць полісеміі. Прамыя (асноўныя) і пераносныя (вытворныя) значэнні, дынаміка іх узаемаадносін. Стадыі эвалюцыі лексічнага значэння мнагазначнага слова (інавацыя, узуальна замацаванае новае значэнне, узнікненне амонімаў). Метафарычныя, метанімічныя і сінекдахальныя сувязі значэнняў мнагазначнага слова.

Слова ў сістэме і ў маўленчай рэалізацыі. Сістэмныя адносіны ў лексіцы. Тыпы слоўных апазіцый. Апазіцыі фармальнай тоеснасці. Амонімы. Структурныя тыпы амонімаў. Прычыны ўзнікнення амонімаў (сацыялінгвістычныя, фанетычныя, словаўтваральныя, звязаныя з распадам мнагазначнасці). Крытэрыі размежавання аманіміі і мнагазначнасці. Міжмоўныя амонімы. Апазіцыі семантычнай тоеснасці. Сінонімы. Класіфікацыя сінонімаў. Сінанімічны рад, дамінанта як ідэнтыфікатар членаў сінанімічнага рада. Семантычныя функцыі сінонімаў (замяшчэнне, удакладненне, ацэнка, функцыя стылявой арганізацыі тэксту). Кантэкстуальныя сінонімы. Лексічная канверсія. Тыпалогія і функцыі канверсіваў. Апазіцыі семантычнай процілегласці. Антонімы. Структурная і семантычная класіфікацыя антонімаў. Кантэкстуальныя антонімы. Фармальна-семантычныя апазіцыі. Паронімы. Крытэрыі вызначэння і шляхі ўзнікнення паронімаў. Амалексы, гетэралексы, паралексы. Дыферэнцыяцыя слоўнікавага складу: паводле паходжання (уласнабеларуская лексіка, запазычаная лексіка); паводле наяўнасці / адсутнасці гістарычнай перспектывы (устарэлая лексіка, неалагізмы); паводле сферы ўжывання (агульнаўжывальная лексіка, лексіка абмежаванага ўжывання; навуковая, прафесійная, паэтычная, дыялектная лексіка); паводле эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкі (міжстылявая, або нейтральная, і стылістычна афарбаваная лексіка:

кніжная, гутарковая, прастамоўная); паводле характару функцыянавання (актыўная і пасіўная лексіка, патэнцыяльныя словы, аказіяналізмы).

Спецыфіка стылістычнага выкарыстання лексічных адзінак. Сацыяльныя і ўнутрымоўныя фактары развіцця лексічнага складу беларускай мовы.

## ЛЕКСІКАГРАФІЯ

Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства. Прадмет і задачы лексікаграфіі. Тэарэтычная і практычная лексікаграфія. Асноўныя паняцці практычнай лексікаграфіі: слоўнік, слоўнікавы артыкул, семантызацыя, граматычны і фанетычны каментарый да слова (вакабулы), экземпліфікацыя, памета. Праблематыка тэарэтычнай лексікаграфіі. Стварэнне навуковай тыпалогіі слоўнікаў, распрацоўка слоўнікаў новых тыпаў, абгрунтаванне макра- і мікраструктуры слоўніка, выпрацоўка прынцыпаў лексікаграфічнай інтэрпрэтацыі слоў.

Слоўнікі-тэзаўрусы і нарматыўныя слоўнікі. Тлумачальныя, дыялектныя, перакладныя, гістарычныя, этымалагічныя, фразеалагічныя, слоўнікі новых слоў і значэнняў, іншамоўных слоў, сінонімаў, антонімаў, амонімаў, паронімаў, асацыятыўныя, арфаграфічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, словаўтваральныя, марфемныя, граматычныя, тэрміналагічныя, частотныя, адваротныя, слоўнікі мовы пісьменнікаў, слоўнікі эпітэтаў і перыфраз. Слоўнікі ўласных імёнаў. Энцыклапедычныя даведнікі (агульныя і прадметныя). Перспектывы лексікаграфічнай працы.

## ФРАЗЕАЛОГІЯ

Фразеалогія як лінгвістычная дысцыпліна. Прадмет і задачы фразеалогіі. Адрозненне слоў і фразеалагізмаў, спалучэнняў слоў і фразеалагізмаў, сказаў і фразеалагізмаў. Семантыка-граматычныя асаблівасці фразеалагізма.

Паняцце фразеалагічнага звароту. Спецыфіка і характэрныя прыметы: узнаўляльнасць, кампанентны склад, структурная фіксаванасць, цэласнасць семантыкі. Віды значэнняў фразеалагізмаў у залежнасці ад спосабу суадносін з рэчаіснасцю (намінатыўна-цэласныя і намінатыўна-расчлянёныя).

Суадносіны фразеалагізмаў з часцінамі мовы. Субстантыўныя,

дзеяслоўныя, ад’ектыўныя, прыслоўныя, выклічнікавыя, мадальныя фразеалагізмы. Марфалогія кампанентаў фразеалагізма (суадносныя формы ліку, склону, трывання і інш.). Марфалагічная нязменнасць некаторых фразеалагізмаў.

Структурныя тыпы фразеалагічных зваротаў (фразеалагізмы, адпаведныя спалучэнню слоў; фразеалагізмы, адпаведныя словазлучэнню; фразеалагізмы, адпаведныя сказу; фразеалагізмы-канструкцыі з адмоўем *не*). Фразеалагізмы нерэгулярных мадэляў. Варыянтнасць у сферы фразеалогіі.

Класіфікацыя фразеалагічных зваротаў з пункту гледжання семантычнай злітнасці. Фразеалагічныя зрашчэнні, адзінствы, выразы і спалучэнні. Крытэрыі іх размежавання: вобразнасць, матываванасць значэння, характар сувязі кампанентаў.

Класіфікацыя фразеалагічных зваротаў паводле паходжання. Крыніцы беларускай фразеалогіі. Уласнабеларускія фразеалагізмы, этнамоўны кампанент іх семантыкі. Запазычаныя (стараславянскія, заходнееўрапейскія фразеалагізмы). Антычная міфалогія і біблейскія тэксты ў беларускай фразеалогіі. Фразеалагічныя калькі і паўкалькі ў беларускай мове.

Крытэрый літаральнай неперакладальнасці як паказчык нацыянальнай ідыяматычнасці мовы.

Стылістычная класіфікацыя фразеалагізмаў. Міжстылёвыя фразеалагізмы. Размоўна-гутарковыя і кніжныя фразеалагізмы, дыяпазон іх экспрэсіўна-стылістычнай афарбоўкі, сфера ўжывання. Сінанімія, антанімія, аманімія і мнагазначнасць фразеалагізмаў у беларускай мове.

## ФРАЗЕАГРАФІЯ

Фразеаграфія як раздзел мовазнаўства. Прадмет і задачы фразеаграфіі. Тэарэтычная і практычная фразеаграфія. Асноўныя паняцці практычнай фразеаграфіі. Праблематыка тэарэтычнай лексікаграфіі. Стварэнне навуковай тыпалогіі фразеалагічных слоўнікаў і даведнікаў, абгрунтаванне макра- і мікраструктуры слоўніка. Будова фразеалагічнага і парэміялагічнага артыкулаў.

Даведнікі па беларускай фразеалогіі і парэміялогіі.

## МАРФЕМІКА

Марфеміка: тэрмін і паняцце. Двухзначнасць тэрміна “марфеміка”. Марфеміка як раздзел мовазнаўства, яе прадмет і задачы. Сувязь марфемікі з іншымі раздзеламі мовазнаўства (фанетыкай і фаналогіяй, лексікалогіяй, словаўтварэннем, марфалогіяй, сінтаксісам). Асноўныя паняцці марфемікі.

Марфеміка як сістэма марфем мовы. Марфема як мінімальная значымая частка слоў (словаформ). Месца марфемы ў сістэме адзінак розных узроўняў мовы: фанема і марфема, склад і марфема, слова і марфема, словазлучэнне і марфема, сказ і марфема. Агульныя (інтэгральныя) і адметныя (дыферэнцыяльныя) прыметы марфемы ў параўнанні з іншымі адзінкамі мовы.

Сістэма марфем у мове. Класіфікацыя марфем паводле іх ролі, значэння, функцыі, месца ў складзе слова (словаформы) і паходжання. Каранёвыя і афіксальныя марфемы, іх асаблівасці і адрозненне. Свабодныя і звязаныя (радыксоіды) карані. Фармальна-семантычнае вылучэнне каранёвых марфем. Цяжкія выпадкі вылучэння каранёвых марфем.

Афікс: тэрмін і паняцце. Класіфікацыя афіксальных марфем паводле месца ў складзе слова (словаформы) адносна кораня: перадкаранёвыя і паслякаранёвыя афіксальныя марфемы. Характарыстыка афіксальных марфем: прэфікс (прыстаўка), суфікс, постфікс, інтэрфікс, конфікс (цыркумфікс), флексія (канчатак). Пытанне аб інтэрфіксах, постфіксах і конфіксах (цыркумфіксах) у лінгвістычнай літаратуры.

Класіфікацыя афіксальных марфем паводле значэння і функцыі: словаўтваральныя (дэрывацыйныя), формаўтваральныя (словазменныя, рэляцыйныя) і словаформаўтваральныя (сінкрэтычныя) афіксы.

Рэгулярныя і нерэгулярныя, прадуктыўныя і непрадуктыўныя афіксы.

Афіксоіды як марфемы пераходнага тыпу. Разнавіднасці афіксоідаў: прэфіксоіды, суфіксоіды. Пытанне пра афіксоіды ў сучаснай лінгвістыцы.

Структурна-семантычныя ўзаемаадносіны афіксальных марфем у складзе слова. Аманімія, полісемія (мнагазначнасць), сінанімія і антанімія марфем.

Экспрэсіўна-стылістычныя функцыі марфем у беларускай мове.

Тыпы афіксальных марфем паводле фанемнага выражэння: матэрыяльна выражаныя (пазітыўныя) і нулявыя марфемы. Нулявыя марфемы і спосабы іх вылучэння ў словах (словаформах).

Адзінкавыя (унікальныя) структурныя часткі слоў (словаформ), іх уласцівасці. Унірадыксоіды і уніфіксы.

Парадыгматычны і сінтагматычны спосабы вылучэння афіксальных марфем. Цяжкія выпадкі вылучэння афіксальных марфем.

Аснова: тэрмін і паняцце. Аснова як абавязковы кампанент структуры слова. Прынцыпы выдзялення асновы слова і асновы словаформы ў сучаснай лінгвістыцы. Аснова і корань. Тыпы асноў: аснова словаформы, аснова слова. Члянімыя / нечлянімыя, вытворныя / невытворныя асновы. Перарваная і неперарваная асновы. Асновы простых і складаных слоў. Суплетыўны тып асноў. Поўны і частковы суплетывізм. Цяжкія выпадкі вызначэння асновы слова і асновы словаформы.

Гістарычныя змены ў марфемнай структуры слоў: апрошчанне, перараскладанне, ускладненне, дэкарэляцыя. Прычыны і характар гэтых з'яў у беларускай мове.

Марфемны аналіз слова, яго спецыфіка, прынцыпы і задачы. Фармальна-семантычны прынцып – аснова марфемнага аналізу. Адрозненне і ўзаемаадносіны марфемнага, словаўтваральнага і этымалагічнага аналізаў.

Марфемаграфія: марфемныя слоўнікі.

## МАРФАНАЛОГІЯ

Марфаналогія: тэрмін і паняцце. Аб'ект і задачы марфаналогіі як раздзела мовазнаўства. Сувязь марфаналогіі з фанетыкай, фаналогіяй, арфаэпіяй, марфемікай, словаўтварэннем, марфалогіяй, сінтаксісам, стылістыкай. Асноўныя адзінкі марфаналогіі, іх характарыстыка. Морфы, аламорфы, варыянты марфемы. Марфанема. Субморф і яго адносіны да морфа. Марфаналагічны рад.

Фанемная структура марфем. Структура каранёвых марфем слоў, якія належаць да розных часцін мовы. Структура афіксальных марфем.

Марфаналагічныя з'явы: чаргаванні (альтэрнацыя) фанем у межах марфемы, чаргаванні фанем на стыку марфем, усячэнне асновы, нарашчэнне асновы (інтэрфіксацыя), накладанне (інтэрферэнцыя, аплікацыя, гаплалогія) морфаў, сцяжэнне.

## СЛОВАЎТВАРЭННЕ

Словаўтварэнне: тэрмін і паняцце. Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства. Прадмет, задачы і месца словаўтварэння сярод іншых

лінгвістычных дысцыплін. Сувязь словаўтварэння з лексікалогіяй, фанетыкай, марфалогіяй і сінтаксісам. Сінхранія і дыяхранія ў словаўтварэнні.

Паняцце словаўтваральнай вытворнасці (матывацыі). Крытэрыі і паказчыкі вытворнасці. Фармальна-семантычная суадноснасць вытворнага слова з утваральным (матывавальным) словам як асноўны прынцып вытворнасці. Віды адносін вытворнасці паміж вытворным словам і ўтваральным (матывавальным) словам. Разыходжанні адносін фармальнай і сэнсавай вытворнасці. Непасрэдная і апасродкаваная вытворнасць. Адносіны множнай вытворнасці.

Вытворнае (матываванае) слова – аб'ект вывучэння ў словаўтварэнні. Уласцівасці вытворных слоў, іх фармальныя і семантычныя сувязі з утваральнымі словамі. Вытворнае і зыходнае (базавае, утваральнае, матывавальнае) слова як словаўтваральная пара, звязаная адносінамі словаўтваральнай вытворнасці. Словаўтваральны фармант як адзінка словаўтваральнай сістэмы.

Словаўтваральная і марфемная структура слова. Суадносіны паняццяў падзельнасці (члянімасці) і вытворнасці слова.

Словаўтваральнае значэнне як асобы тып моўнага значэння. Адрозненне словаўтваральнага значэння ад лексічнага і граматычнага. Сродкі выражэння словаўтваральнага значэння вытворнага слова. Тыпы словаўтваральных значэнняў: транспазіцыйнае, мадыфікацыйнае, мутацыйнае.

Комплексныя адзінкі словаўтваральнай сістэмы, іх характарыстыка: словаўтваральная пара, словаўтваральны ланцужок, словаўтваральная парадыгма, словаўтваральнае гняздо.

Словаўтваральны тып і яго паняцце. Фармальныя і семантычныя прыметы словаўтваральнага тыпа. Прадуктыўнасць словаўтваральнага тыпа. Сінанімія, аманімія, антанімія словаўтваральных тыпаў.

Паняцце словаўтваральнай (марфаналагічнай) мадэлі.

Словаўтваральная катэгорыя як вынік узаемадзеяння сінанімічных словаўтваральных тыпаў.

Спалучальнасць (валентнасць) словаўтваральных марфем у слове. Семантычныя, стылістычныя, лексічныя, словаўтваральныя, фармальныя абмежаванні спалучальнасці словаўтваральных марфем.

Індывідуальна-аўтарская словатворчасць.

Спосаб словаўтварэння: тэрмін і паняцце. Спосабы сінхроннага

словаўтварэння, іх класіфікацыя паводле характару словаўтваральных фармантаў: афіксальныя, бязафіксныя і камбінаваныя (змешаныя) спосабы словаўтварэння.

Афіксальныя спосабы словаўтварэння, іх разнавіднасці. Некамбінаваныя афіксальныя спосабы словаўтварэння: прэфіксальны, суфіксальны, нульсуфіксальны, постфіксальны.

Камбінаваныя афіксальныя спосабы словаўтварэння: прэфіксальна-суфіксальны (конфіксны, цыркумфіксны), прэфіксальна-нульсуфіксальны, прэфіксальна-постфіксальны, суфіксальна-постфіксальны, прэфіксальна-суфіксальна-постфіксальны.

Бязафікснае словаўтварэнне, яго асаблівасці.

Складанне як спосаб словаўтварэння, яго фармальна-структурныя разнавіднасці: аснова-словаскладанне, суфіксальна-складаны, нульсуфіксальна-складаны. Абрэвіяцыя, яе асаблівасці. Віды абрэвіятур.

Адваротнае словаўтварэнне (рэдэрывацыя).

Прадуктыўнасць сінхронных спосабаў словаўтварэння.

Дыяхроннае словаўтварэнне ў беларускай мове. Спосабы дыяхроннага словаўтварэння: лексіка-семантычны, лексіка-сінтаксічны, марфалагічна-сінтаксічны. Разнавіднасці марфалагічна-сінтаксічнага словаўтварэння: субстантывацыя, ад’ектывацыя, адвербіялізацыя, пранаміналізацыя, нумералізацыя, прэпазіцыяналізацыя і інш. Прадуктыўнасць дыяхронных спосабаў словаўтварэння.

Паняцце словаўтваральнай нормы. Узаемадзеянне і канкурэнцыя словаўтваральных тыпаў. Словаўтваральная варыянтнасць.

Актыўныя працэсы ў сістэме сучаснага беларускага словаўтварэння.

Словаўтваральны аналіз, яго спецыфіка, прынцыпы і задачы.

Словаўтваральныя слоўнікі. Адваротныя слоўнікі.

## МАРФАЛОГІЯ

Марфалогія як раздзел граматыкі, яе прадмет і задачы. Сувязь марфалогіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства (фанетыкай і фаналогіяй, лексікалогіяй і словаўтварэннем, сінтаксісам). Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі: граматычная форма, граматычны сродак, граматычнае значэнне і граматычная катэгорыя. Асноўныя спосабы і сродкі выражэння граматычных значэнняў у беларускай мове. Класіфікацыйныя (лексіка-граматычныя) і словазмяняльныя граматычныя катэгорыі. Класіфікацыя

граматычных катэгорый паводле тыпаў апазіцый граматычных значэнняў: бінарныя і небінарныя, эквіпалентныя і прыватыўныя катэгорыі.

Парадыгматычны і функцыянальны падыходы да вывучэння граматычных адзінак. Парадыгматычная марфалогія як навука аб правілах і формах словазмянення.

Прынцыпы і крытэрыі аб'яднання слоў у лексіка-граматычныя класы – часціны мовы. Анамасіялагічны, навуковы і дыдактычны падыходы да выдзялення часцін мовы. Сістэма часцін мовы ў беларускай мове. Спрэчныя пытанні класіфікацыі часцін мовы. Пераходныя з'явы ў сістэме часцін мовы.

### Назоўнік

Назоўнік як часціна мовы. Семантыка-камунікатыўная адметнасць і граматычныя асаблівасці назоўніка як носьбіта агульнага значэння прадметнасці. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў як адлюстраванне ўзаемасувязі лексікі і марфалогіі. Назоўнікі агульныя і ўласныя, канкрэтныя і абстрактныя, адушаўлёныя і неадушаўлёныя, асабовыя, зборныя, рэчыўныя; сінгулятывы, іх семантычныя і граматычныя асаблівасці.

Сістэма граматычных катэгорый назоўніка: катэгорыі роду, ліку і склону. Катэгорыя роду назоўнікаў. Значэнне і сродкі выражэння граматычных значэнняў мужчынскага, жаночага і ніякага роду. Пытанне аб назоўніках агульнага роду ў беларускай мове. Граматычны род абрэвіятур. Род марфалагічна нязменных назоўнікаў. Разыходжанні ў граматычным родзе некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Катэгорыя ліку назоўнікаў. Значэнне і сродкі выражэння лікавага супрацьпастаўлення. Адзіночналікавыя і множналікавыя назоўнікі. Рэшткі парнага ліку ў сучаснай беларускай мове. Несупадзенне ў граматычным ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Катэгорыя склону назоўнікаў. Сістэма склонаў назоўнікаў у сучаснай беларускай мове. Пытанне аб значэннях склонавых форм у лінгвістычнай літаратуры. Сродкі выражэння склонавых значэнняў у беларускай мове. Роля прыназоўнікаў у выражэнні склонавых значэнняў. Рэшткі формы клічнага склону.

Скланенне назоўнікаў. Словазменная парадыгма назоўніка. Залежнасць склонавых канчаткаў назоўнікаў ад прыналежнасці да лексіка-граматычнага разраду і ад характару асноў. Назоўнікі першага, другога і трэцяга

скланенняў, рознаскланяльныя і нескланяльныя назоўнікі; назоўнікі ад'ектыўнага і змешанага тыпаў скланення. Склонавыя канчаткі назоўнікаў розных тыпаў скланення. Варыянты склонавых канчаткаў назоўнікаў. Дынаміка склонавых форм назоўніка і праблема кадыфікацыі склонавых канчаткаў назоўнікаў у сучаснай беларускай мове. Асаблівасці выкарыстання назоўнікаў і іх склонавых форм у тэкстах розных стыляў.

Словаўтварэнне назоўнікаў. Асноўныя спосабы і сродкі ўтварэння назоўнікаў. Суфіксацыя, нулявая суфіксацыя, прэфіксацыя, канфіксацыя як разнавіднасці афіксацыі. Бязафіксныя назоўнікі. Утварэнне складаных назоўнікаў. Абрэвіятуры ў мікрасістэме назоўнікаў, асаблівасці іх утварэння. Назоўнікі са значэннем суб'ектыўнай ацэнкі, асаблівасці іх утварэння і ўжывання. Лексіка-семантычнае і марфалагічна-сінтаксічнае словаўтварэнне як разнавіднасці немарфемных спосабаў утварэння назоўнікаў.

Назоўнікі як база для ўтварэння слоў іншых часцін мовы.

## Прыметнік

Прыметнік як часціна мовы. Семантыка-камунікатыўная адметнасць і граматычныя катэгорыі прыметніка як носьбіта непрацэсуальнай прыметы. Разрады прыметнікаў: якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі, іх значэнне і граматычныя формы. Асаблівасці ўтварэння і ўжывання прыналежных прыметнікаў. Пераход прыметнікаў з аднаго разраду ў іншы. Поўныя і кароткія формы якасных прыметнікаў, іх ужыванне і сінтаксічная роля. Сцягнутыя формы прыметнікаў і іх роля ў мастацкім тэксце. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх значэнне і ўтварэнне. Пытанне аб граматычным статусе катэгорыі ступеней параўнання прыметнікаў у беларускай мове. Асаблівасці катэгорыі ступеней параўнання прыметнікаў у беларускай мове ў параўнанні з рускай мовай. Прыметнікі са значэннем ацэнкі і меры якасці.

Скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў. Пытанне аб аб'ёме словазменнай парадыгмы прыметнікаў розных разрадаў. Варыянтнасць склонавых канчаткаў прыметнікаў.

Выкарыстанне прыметнікаў розных разрадаў у тэкстах розных стыляў як сродку слоўнага жывапісу, сродку інфармацыйнай, класіфікацыйнай характарыстыкі прадметаў.

Словаўтварэнне прыметнікаў. Спосабы ўтварэння прыметнікаў, ступень іх прадуктыўнасці ў сучаснай беларускай мове. Афіксальныя спосабы ўтварэння прыметнікаў: суфіксальны, нульсуфіксальны, прэфіксальна-суфіксальны, прэфіксальна-нульсуфіксальны. Складанне (суфіксальна-складаныя, нульсуфіксальна-складаныя прыметнікі) і зрашчэнне. Ад’ектывацыя як разнавіднасць марфалагічна-сінтаксічнага спосабу ўтварэння прыметнікаў.

Словаўтваральная сінанімія прыметнікаў.

Прыметнік як база для ўтварэння слоў іншых часцін мовы.

## Лічэбнік

Лічэбнік як часціна мовы. Семантычныя асаблівасці і спецыфіка граматычных катэгорый лічэбнікаў як слоў з колькасна-лікавым значэннем. Разрады лічэбнікаў паводле значэння і структуры. Колькасныя (уласнаколькасныя і зборныя) лічэбнікі, асаблівасці іх сінтаксічнай спалучальнасці з назоўнікамі. Дробавыя лічэбнікі, іх семантычныя і структурныя асаблівасці. Пытанне аб парадкавых лічэбніках і іх месцы ў сістэме часцін мовы, асаблівасці семантыкі і ўтварэння. Простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі, іх структура. Скланенне лічэбнікаў розных разрадаў. Няпэўнаколькасныя словы.

Асаблівасці выкарыстання лічэбнікаў у кантэксце.

Словаўтварэнне лічэбнікаў. Невытворныя і вытворныя лічэбнікі. Асноўныя спосабы марфемнага ўтварэння лічэбнікаў: суфіксальны, нульсуфіксальны. Складанне і яго асаблівасці. Утварэнне парадкавых лічэбнікаў (простых, складаных, састаўных).

Ужыванне лічэбнікаў у ролі іншых часцін мовы. Лічэбнік як утваральная база для самастойных часцін мовы.

## Займеннік

Займеннік як часціна мовы. Семантыка-камунікатыўная і граматычная адметнасць займеннікаў як слоў-“замяняльнікаў”, “указальнікаў”. Пытанне аб месцы займеннікаў у сістэме часцін мовы. Тэрмін “займеннік” як сумяшчэнне двух значэнняў гэтага разраду слоў: лексічнага і функцыянальнага.

Семантычная класіфікацыя займеннікаў. Разрады займеннікаў паводле лексічнага значэння: асабовыя, зваротны, прыналежныя, указальныя,

азначальныя, пытальныя, адносныя, адмоўныя, няпэўныя (неазначальныя).

Марфалагічная класіфікацыя займеннікаў. Разрады займеннікаў паводле суадносін з іншымі часцінамі мовы. Займеннікі-назоўнікі. Катэгорыя роду, адушаўлёнасці-неадушаўлёнасці ў займенніках-назоўніках. Займеннікі-прыметнікі. Займеннікі-лічэбнікі. Займеннікі-прыслоўі.

Скланенне займеннікаў розных разрадаў. Варыянты склонавых форм займеннікаў.

Займеннік як сродак сінтаксічнай арганізацыі тэксту.

Словаўтварэнне займеннікаў. Асноўныя спосабы марфемнага (афіксальнага) утварэння займеннікаў: прэфіксальны, суфіксальны, постфіксальны. Спосаб словаскладання і яго выкарыстанне пры марфемным (бязафіксным) утварэнні займеннікаў.

Пераход іншых часцін мовы ў займеннікі. Пранаміналізацыя і яе роля ва ўтварэнні займеннікаў марфалагічна-сінтаксічным спосабам.

Займеннік як база для ўтварэння іншых часцін мовы (назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў, часціц, злучнікаў).

## Дзеяслоў

Дзеяслоў як часціна мовы. Асаблівасці семантыкі і граматычная адметнасць дзеяслова як носьбіта працэсуальнай прыметы. Граматычныя катэгорыі і граматычныя формы дзеяслова. Пытанне пра аб’ём дзеяслоўнай парадыгмы ў сучаснай лінгвістыцы.

Неазначальная форма дзеяслова (інфінітыў), яе ўтварэнне, граматычнае значэнне, марфалагічныя адзнакі і сінтаксічныя функцыі. Інфінітыў як назва дзеяння.

Асновы дзеяслова: інфінітыва і цяперашняга (будучага простага) часу. Спосабы вызначэння асноў дзеясловаў. Роля асноў дзеясловаў ва ўтварэнні дзеяслоўных формаў.

Класы дзеясловаў. Прадуктыўныя і непрадуктыўныя класы дзеясловаў.

Пераходныя (прама пераходныя і ўскосна пераходныя) і непераходныя дзеясловы, асаблівасці іх семантыкі і спалучэння са склонавымі формамі назоўніка.

Непрэдыкатыўныя катэгорыі дзеяслова.

Катэгорыя трывання дзеяслова. Дзеясловы закончанага і незакончанага трывання, іх лексіка-граматычныя асаблівасці і спосабы ўтварэння.

Асаблівасці ўтварэння суадносных (карэлятыўных) трывальных пар деясловаў. Аднатрывальныя і двухтрывальныя дзеясловы. Спосабы дзеяслоўнага дзеяння як лексіка-граматычныя разрады дзеяслова, іх сувязь з іншымі разрадамі і граматычнымі катэгорыямі дзеяслова.

Зваротныя дзеясловы, іх утварэнне і лексіка-граматычная адметнасць. Разрады зваротных дзеясловаў паводле значэння: уласна-зваротныя, узаемна-зваротныя, агульна-зваротныя, ускосна-зваротныя, пасіўна-якасныя, актыўна-безаб'ектныя, зваротна-пасіўныя, зваротна-залежныя.

Зваротныя дзеясловы, матываваныя непераходнымі дзеясловамі. Дзеясловы "толькі зваротныя" *(reflexiva tantum)* у сучаснай беларускай мове.

Катэгорыя стану дзеяслова. Пытанне пра стан дзеяслова ў сучаснай лінгвістыцы. Незалежны і залежны стан дзеяслова, спосабы і сродкі выражэння станавых значэнняў. Стан і зваротнасць-незваротнасць дзеясловаў. Суадноснасць парадыгм дзеясловаў незалежнага і залежнага стану. Аднастанавыя дзеясловы.

Прэдыкатыўныя катэгорыі дзеяслова.

Катэгорыя ладу дзеяслова як словазменная дзеяслоўная катэгорыя. Граматычнае значэнне катэгорыі ладу. Сродкі выражэння мадальнага значэння рэальнасці-ірэальнасці дзеяння. Граматычныя формы абвеснага, загаднага і ўмоўнага ладу. Лад і час дзеяслова, лад і асоба дзеяслова, лад і род дзеяслова.

Абвесны лад, яго значэнне, формы і асаблівасці ўжывання. Аналітычныя формы ў сістэме дзеясловаў абвеснага ладу.

Загадны лад, яго значэнне, утварэнне і ўжыванне. Граматычныя сродкі выражэння значэнняў загаднага ладу. Аналітычныя формы загаднага ладу. Варыянты граматычных форм загаднага ладу.

Умоўны лад дзеяслова і яго граматычнае значэнне. Спосабы ўтварэння граматычных форм умоўнага ладу. Аналітычныя формы ўмоўнага ладу.

Ужыванне форм аднаго ладу ў значэнні іншага.

Катэгорыя часу дзеяслова. Формы дзеясловаў цяперашняга, прошлага і будучага (простага і складанага) часу і іх значэнне. Утварэнне і ўжыванне форм даўномінулага часу. Ужыванне форм аднаго часу ў значэнні іншага. Сувязь катэгорыі часу дзеяслова з катэгорыяй трывання ў беларускай мове.

Катэгорыі роду і ліку дзеясловаў, іх формы і спецыфіка функцыянавання ў сістэме форм абвеснага, загаднага і ўмоўнага ладу, цяпершняга, будучага і прошлага часу. Суадноснасць катэгорыі роду і катэгорыі асобы дзеяслова.

Катэгорыя асобы дзеяслова. Граматычныя значэнні першай, другой і трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку, іх выражэнне і ўжыванне. Суадноснасць катэгорыі асобы з катэгорыямі часу і ладу дзеяслова. Марфалагічныя сродкі выражэння асобы. Значэнні форм асобы і сінтаксічныя ўмовы іх ужывання. Безасабовыя дзеясловы, іх значэнне, граматычныя формы і ўжыванне. Выкарыстанне ў мове форм адной асобы са значэннем другой.

Спражэнне дзеясловаў. Сістэма асабовых канчаткаў дзеясловаў першага і другога спражэння. Спосабы вызначэння спражэнняў дзеясловаў. Рознаспрагальныя дзеясловы.

Сэнсавая і выяўленчая роля дзеяслова ў тэкстах розных стыляў.

**Дзеепрыметнік** як дзеяслоўна-іменная форма. Граматычная характарыстыка дзеепрыметнікаў. Пытанне аб месцы дзеепрыметнікаў у сістэме часцін мовы. Семантычная, граматычная і сінтаксічная суадноснасць дзеепрыметнікаў з дзеясловамі і прыметнікамі. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, цяперашняга і прошлага часу, іх значэнні, спосабы ўтварэння, асаблівасці ўжывання ў сучаснай беларускай мове (у параўнанні з рускай). Пераходнасць/непераходнасць дзеясловаў і асаблівасці ўтварэння дзеепрыметнікаў розных разрадаў. Поўныя і кароткія формы дзеепрыметнікаў залежнага стану і іх ужыванне. Ад’ектывацыя і субстантывацыя дзеепрыметнікаў.

**Дзеепрыслоўе** як дзеяслоўна-прыслоўная форма. Граматычная характарыстыка дзеепрыслоўя. Пытанне аб месцы дзеепрыслоўяў у сістэме часцін мовы. Суадноснасць дзеепрыслоўяў з дзеясловамі і прыслоўямі. Дзеепрыслоўе і інфінітыў. Супрацьпастаўленне дзеепрыслоўяў спрагальным (асабовым) формам дзеяслова. Граматычныя катэгорыі дзеепрыслоўяў. Утварэнне дзеепрыслоўяў незакончанага і закончанага трывання. Ужыванне дзеепрыслоўяў у сучаснай беларускай літаратурнай мове. Адвербіялізацыя дзеепрыслоўяў.

Словаўтварэнне дзеясловаў. Спосабы ўтварэння дзеясловаў і іх прадуктыўнасць у беларускай мове. Марфалагічны спосаб як галоўны ў

сістэме дзеяслоўнага словаўтварэння. Афіксальныя разнавіднасці спосабаў утварэння дзеясловаў. Спосабы складання пры ўтварэнні дзеясловаў.

Дзеясловы як база для ўтварэння слоў іншых часцін мовы (назоўнікаў, прыметнікаў, прыслоўяў, слоў катэгорыі стану, мадальных слоў, прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц, звязак, выклічнікаў). Пераход дзеясловаў у іншыя часціны мовы.

## Прыслоўе

Прыслоўе як часціна мовы. Семантычныя асаблівасці і граматычная адметнасць прыслоўяў як слоў са значэннем прыметы дзеяння ці прыметы прыметы.

Тыпы прыслоўяў у залежнасці ад характару выражэння лексічнага значэння: знамянальныя і займеннікавыя прыслоўі. Групы займеннікавых прыслоўяў.

Лексіка-граматычныя разрады прыслоўяў: азначальныя і акалічнасныя. Азначальныя прыслоўі і іх падразрады: якасныя, колькасныя, спосабу дзеяння, параўнання, сумеснасці. Акалічнасныя прыслоўі і іх падразрады: месца, часу, прычыны, мэты. Ужыванне прыслоўяў адных разрадаў са значэннем іншых.

Ступені параўнання (вышэйшая і найвышэйшая) якасных прыслоўяў, іх утварэнне і ўжыванне. Марфаналагічныя з’явы пры ўтварэнні форм ступеней параўнання прыслоўяў. Суадноснасць ступеней параўнання якасных прыслоўяў і ступеней параўнання якасных прыметнікаў.

Спосабы ўтварэння прыслоўяў. Сінхранія і дыяхранія ў словаўтварэнні прыслоўяў. Афіксальныя спосабы ўтварэння прыслоўяў: суфіксальны, прэфіксальны, конфіксны. Спосаб складання і яго роля ва ўтварэнні прыслоўяў. Складанне ў спалучэнні з афіксацыяй.

Лексічна-сінтаксічны і марфалагічна-сінтаксічны спосабы ўтварэння прыслоўяў. Прадуктыўнасць спосабаў словаўтварэння прыслоўяў.

Прыслоўе як база для ўтварэння самастойных і службовых часцін мовы.

Пераход прыслоўяў у назоўнікі, словы катэгорыі стану, прыназоўнікі, злучнікі і часціцы. Прыслоўі і мадальныя словы.

Тэкстаўтваральная (інфармацыйная, ацэначная) роля прыслоўяў у тэкстах розных стыляў.

## Безасабова-прэдыкатыўныя словы

Пытанне аб безасабова-прэдыкатыўных словах (словах катэгорыі стану) у лінгвістычнай літаратуры. Безасабова-прэдыкатыўныя словы як асобны лексіка-граматычны клас, іх семантычныя, марфалагічныя, словаўтваральныя, сінтаксічныя адметнасці. Безасабова-прэдыкатыўныя словы і прыслоўі: агульныя і адметныя адзнакі.

Разрады безасабова-прэдыкатыўных слоў паводле значэння.

Ступені параўнання безасабова-прэдыкатыўных слоў, іх формы, утварэнне і адрозненне ад форм ступеней параўнання прыслоўяў і прыметнікаў.

Словаўтварэнне безасабова-прэдыкатыўных слоў. Словаўтваральная суадноснасць безасабова-прэдыкатыўных слоў з іншымі самастойнымі часцінамі мовы: назоўнікамі, прыметнікамі, дзеясловамі, прыслоўямі. Ужыванне безасабова-прэдыкатыўных слоў у беларускай літаратурнай мове.

## Мадальныя словы

Пытанне аб мадальных словах у мовазнаўстве. Сінтаксічная аснова выдзялення мадальных слоў у асобную групу. Месца мадальных слоў у сістэме часцін мовы. Іншыя часціны мовы як крыніца папаўнення групы мадальных слоў у беларускай мове. Адрозненне мадальных слоў ад слоў іншых часцін мовы. Разрады мадальных слоў паводле значэння, іх роля ў тэксце.

## Службовыя часціны мовы

Агульная характарыстыка службовых слоў. Семантычны і сінтаксічны прынцыпы як асноўныя для вызначэння службовых часцін мовы. Супрацьпастаўленне службовых слоў паўназначным на аснове функцыі ў сказе.

Класіфікацыя службовых слоў паводле граматычных значэнняў і функцый у сказе. Прыназоўнікі і злучнікі як непаўназначныя службовыя часціны мовы.

## Прыназоўнікі

Прыназоўнікі як службовыя словы, іх семантычныя, марфалагічныя і сінтаксічныя адзнакі. Функцыі прыназоўнікаў. Класіфікацыя прыназоўнікаў

паводле паходжання і структуры. Вытворныя і невытворныя прыназоўнікі. Асаблівасці вытворных прыназоўнікаў, іх суадноснасць з іншымі часцінамі мовы. Адпрыслоўныя, адыменныя, аддзеяслоўныя вытворныя прыназоўнікі.

Простыя, складаныя і састаўныя прыназоўнікі.

Значэнні прыназоўнікаў. Ужыванне прыназоўнікаў з ускоснымі склонамі назоўнікаў. Варыянты прыназоўнікаў. Сінаніміка прыназоўнікаў.

Некаторыя асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове.

Спосабы ўтварэння прыназоўнікаў. Пераход паўназначных слоў у прыназоўнікі (прэпазіцыяналізацыя).

Прыназоўнікі як база для ўтварэння прэфіксаў, злучнікаў.

## Злучнікі

Злучнікі як службовыя словы, іх семантычныя і граматычныя адзнакі. Класіфікацыя злучнікаў паводле функцыянальнага значэння: злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі. Разнавіднасці злучальных злучнікаў, іх ужыванне. Падпарадкавальныя злучнікі, іх асаблівасці і разнавіднасці. Адрозненне падпарадкавальных злучнікаў ад злучальных слоў (займеннікаў і прыслоўяў).

Разрады злучнікаў паводле  паходжання, саставу, спосабу ўжывання.

Вытворныя злучнікі, спосабы іх утварэння.

Ужыванне іншых часцін мовы (займеннікаў, прыслоўяў, часціц, мадальных слоў) у функцыі злучнікаў.

## Звязкі

Пытанне аб звязках у лінгвістычнай літаратуры. Пераход у разрад звязак дзеясловаў з аслабленым лексічным значэннем.

Тыпы звязак паводле лексіка-граматычнага значэння: абстрактныя (незнамянальныя), паўабстрактныя (паўзнамянальныя), знамянальныя.

## Часціцы

Часціцы як непаўназначная часціна мовы. Семантычныя і граматычныя асаблівасці часціц. Месца часціц у сістэме часцін мовы.

Разрады часціц паводле іх функцыянальнага значэння: семантычныя, мадальныя і мадальна-валявыя, эмацыянальна-экспрэсіўныя. Словаўтваральныя і формаўтваральныя часціцы.

Разрады часціц паводле паходжання. Суадносіны вытворных часціц з паўназначнымі словамі (займеннікамі, дзеяслоўнымі формамі, прыслоўямі) і выклічнікамі. Структура часціц. Састаўныя часціцы як сродак экспрэсіі. Утварэнне састаўных часціц.

Развіццё мадальнага значэння ў часціцах. Пераход у часціцы слоў іншых часцін мовы. Роля часціц у тэксце.

Часціцы як база для ўтварэння злучнікаў і марфем (постфіксаў).

## Выклічнікі

Месца выклічнікаў у сістэме часцін мовы, адрозненне выклічнікаў ад паўназначных і непаўназначных слоў.

Разрады выклічнікаў паводле значэння: эмацыянальныя, волевыяўленчыя (пабуджальныя, імператыўныя) і моўнага этыкету.

Разрады выклічнікаў паводле пажоджання. Невытворныя і вытворныя выклічнікі. Суадносіны вытворных выклічнікаў з назоўнікамі, дзеясловамі, прыслоўямі. Выклічнікі-запазычанні з іншых моў. Структурныя тыпы выклічнікаў.

Словаўтварэнне выклічнікаў. Ужыванне выклічнікаў у вуснай і пісьмовай мове.

Пераход у выклічнікі слоў з іншых часцін мовы (інтэр'ектывацыя). Выклічнікі як база для ўтварэння слоў паўназначных часцін мовы.

## Гукаперайманні

Гукаперайманні, іх функцыі ў сказе і тэксце. Падабенства і адрозненне гукаперайманняў ад выклічнікаў. Пытанне аб статусе гукаперайманняў як лексічных адзінак (слоў). Лексічная, марфалагічная і сінтаксічная характарыстыка гукаперайманняў.

Гукапераймальныя словы як база для ўтварэння дзеясловаў.

# СІНТАКСІС

Прадмет і задачы сінтаксісу. Сінтаксіс сярод лінгвістычных дысцыплін.

Асноўныя аспекты апісання сінтаксісу: структурны, камунікатыўны, функцыянальны, семантычны, структурна-семантычны, прагматычны, стылістычны. Сучасная беларуская сінтаксічная навука: актуальны стан, праблемы, канцэпцыі.

Паняцце сінтаксічнай сувязі. Асноўныя віды сінтаксічнай сувязі: злучэнне (паратаксіс) і падпарадкаванне (гіпатаксіс). Асноўныя віды

сінтаксічных адносін: прэдыкатыўныя, непрэдыкатыўныя: злучальныя (паратаксічныя), падпарадкавальныя (гіпатаксічныя). Сродкі выражэння сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні, простым сказе, складаным сказе.

Паняцце валентнасці, яе тыпы: лагічная, семантычная, сінтаксічная валентнасць; абавязковая (аблігаторная), неабавязковая (факультатыўная) валентнасць. Паняцце дыстрыбуцыі. Валентнасць і дыстрыбуцыя.

Паняцце спалучальнасці. Валентнасць і спалучальнасць. Семантычная, сінтаксічная, лексічная спалучальнасць слоў у беларускай мове. Спалучальнасныя ўласцівасці розных часцін мовы.

Сістэма сінтаксічных адзінак: сінтаксема, словазлучэнне, просты сказ, складаны сказ, складанае сінтаксічнае цэлае (звышфразавае адзінства), тэкст.

Мова як сістэма vs. маўленне як рэалізацыя моўнай сістэмы (канцэпцыя А.Я. Міхневіча). Сказ (адзінка мовы) як мадэль. Выказванне (адзінка маўлення) як рэалізацыя мадэлі ў маўленні.

## Словазлучэнне

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Дыферэнцыяльныя прыметы словазлучэння. Словазлучэнне і слова. Словазлучэнне і сказ. Структурная схема і парадыгма словазлучэнняў.

Асноўныя падыходы да разумення граматычнай прыроды словазлучэнняў: “вузкі” (словазлучэнні – толькі падпарадкавальныя словаспалучэнні; працы М. С. Яўневіча, П. У. Сцяцко, В. У. Протчанкі, Л. П. Падгайскага, А. І. Наркевіча, А. Я. Міхневіча); “залатая сярэдзіна” (словазлучэннямі з’яўляюцца ўсе непрэдыкатыўныя словаспалучэнні; працы Л. І. Бурака, М. Г. Булахава); “шырокі” (словазлучэнні – як прэдыкатыўныя, так і непрэдыкатыўныя словаспалучэнні; працы Г. Н. Клюсава). Аб’ём паняцця “словазлучэнне”. Праблема вылучэння прэдыкатыўных і паратаксічных словазлучэнняў.

Класіфікацыя словазлучэнняў у сучаснай лінгвістычнай літаратуры: свабодныя і несвабодныя; прэдыкатыўныя і непрэдыкатыўныя; простыя і складаныя. Лексіка-граматычныя тыпы словазлучэнняў: назоўнікавыя, прыметнікавыя, лічэбнікавыя, займеннікавыя, дзеяслоўныя і прыслоўныя. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў сучаснай беларускай мове: структура, значэнне, функцыі.

Сінтаксічная сувязь кампанентаў непрэдыкатыўных словазлучэнняў: злучальная (паратаксічная) і падпарадкавальная (гіпатаксічная).

Дыферэнцыяльныя прыметы злучальнай сувязі: адкрытасць / закрытасць. Разнавіднасці злучальнай сувязі: з'яднанне, раз'яднанне, пераразʼяднанне.

Дыферэнцыяльныя прыметы падпарадкавальнай сувязі: прадказальнасць / непрадказальнасць, абавязковасць / неабавязковасць. Разнавіднасці падпарадкавальнай сувязі: дапасаванне (поўнае і няпоўнае; склонавы паралелізм); кіраванне (беспрыназоўнікавае і прыназоўнікавае; моцнае і слабае); прымыканне (уласнае і іменнае). Размежаванне выпадкаў слабага кіравання і іменнага прымыкання. Асаблівасці і нацыянальная адметнасць дапасавання і кіравання ў беларускай літаратурнай мове.

Тыпалогія семантыка-сінтаксічных адносін паміж кампанентамі падпарадкавальнага (гіпатаксічнага) словазлучэння: аб'ектныя, суб'ектныя, азначальныя (атрыбутыўныя), акалічнасныя (сітуацыйныя), камплетыўныя. Сінкрэтызм семантыка-сінтаксічных адносін на ўзроўні падпарадкавальнага словазлучэння. Сродкі выражэння семантыка-сінтаксічных адносін.

Сінтаксічная сінаніміка сучаснай беларускай мовы.

## Сказ

Паняцце сказа. Сказ як прэдыкатыўная адзінка мовы. Дыферэнцыяльныя прыметы сказа: камунікатыўнасць, прапазіцыйнасць, прэдыкатыўнасць, граматычная і інтанацыйная аформленасць, сэнсавая закончанасць і самастойнасць.

Прэдыкатыўнасць як асноўная сінтаксічная катэгорыя сказа. Субкатэгорыі прэдыкатыўнасці: мадальнасць, тэмпаральнасць, персанальнасць. Монапрэдыкатыўнасць і поліпрэдыкатыўнасць як адрознівальныя прыметы простага і складанага сказаў.

Граматычнае значэнне і граматычная форма сказа. Паняцце сінтаксічнай мадэлі сказа.

Сінтаксічная мадэль vs. структурная схема сказа. Універсальнае і спецыфічнае ў сінтаксічных мадэлях беларускай мовы (пры супастаўленні з рускай і іншымі мовамі).

Сінтаксічная парадыгма (сінтаксічнае поле) сказа.

Сінтаксічная сувязь кампанентаў сказа. Разнавіднасці прэдыкатыўнай сувязі: каардынацыя, суразмяшчэнне, прыцягненне. Паўпрэдыкатыўная сувязь. Далучальная сувязь. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі сказа, сродкі іх выражэння і спосабы рэалізацыі ў беларускай мове.

Класіфікацыя сказаў: паводле будовы – простыя і складаныя; паводле мадальнасці – сцвярджальныя і адмоўныя; паводле мэты выказвання – апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя; паводле інтанацыі – няклічныя і клічныя; паводле структурнай арганізацыі – члянімыя і нечлянімыя; паводле колькасці саставаў – аднасастаўныя і двухсастаўныя; паводле наяўнасці / адсутнасці пашыральнікаў прэдыкатыўнай асновы сказа – развітыя і неразвітыя; паводле наяўнасці / адсутнасці структурна неабходных кампанентаў – поўныя і няпоўныя; паводле наяўнасці / адсутнасці элементаў ускладнення – ускладненыя і няўскладненыя.

Аспекты вывучэння сказа: структурны, семантычны, структурна-семантычны, камунікатыўны, прагматычны і інш.

## Просты сказ

Паняцце простага сказа. Дыферэнцыяльныя прыметы простага сказа. Просты сказ як двухбаковая сінтаксічная адзінка з узаемаабумоўленымі планам зместу (семантычнай, глыбіннай структурай) і планам выражэння (фармальнай, паверхневай структурай). Паняцце глыбіннага і паверхневага сінтаксісу. Суадносіны глыбіннай і паверхневай структур сказа.

Семантычная арганізацыя простага сказа. Намінатыўнае значэнне сказа. Дыктум (прапазіцыя) і модус як два складнікі намінатыўнага значэння сказа. Структура пазамоўнай сітуацыі – семантычная структура сказа.

Паняцце прапазіцыі. Тыпы прапазіцый: падзейная (існавання, стану, руху, успрымання, дзеяння) і лагічная (характарызацыі, ідэнтыфікацыі, рэляцыі). Структура прапазіцыі: прэдыкат і актанты (аргументы, семантычныя функцыі (ролі), глыбінныя склоны), іх тыпы. Сірканстанты, атрыбуты, іх тыпы.

Фармальная арганізацыя простага сказа. Традыцыйнае вучэнне аб членах сказа. Галоўныя і даданыя члены сказа як канструктыўныя кампаненты фармальнай структуры сказа. Сучасны стан вучэння аб членах сказа. Праблема вылучэння галоўных і даданых членаў сказа ў сучаснай лінгвістыцы.

Крытыка традыцыйнага вучэння аб членах сказа ў рэчышчы функцыянальнага сінтаксісу і функцыянальна-камунікатыўнай граматыкі.

Двухсастаўны сказ як асноўны структурна-семантычны тып простага сказа. Прэдыкатыўная аснова простага сказа. Суадносіны дзейніка і выказніка ў фармальнай структуры сказа. Вербацэнтрычная канцэпцыя сказа.

Структурныя тыпы дзейніка і выказніка і спосабы іх выражэння ў сучаснай беларускай мове. Сувязь паміж дзейнікам і выказнікам і яе разнавіднасці. Праблема аднародных дзейнікаў і выказнікаў.

Даданыя члены сказа: дапаўненне (прамое / ускоснае); азначэнне (дапасаванае / недапасаванае; прыдатак); акалічнасць (месца, часу, прычыны, мэты, спосабу дзеяння, меры і ступені, умовы, уступкі). Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя, дэтэрмінаваныя і недэтэрмінаваныя даданыя члены сказа. Сінкрэтызм у сістэме членаў сказа.

Лінгвістычны статус аднасастаўных сказаў. Фармальная арганізацыя структурнай асновы аднасастаўных сказаў, яе пашырэнне. Традыцыйная класіфікацыя аднасастаўных сказаў, крытэрыі іх размежавання. Дзеяслоўна-адвербіяльныя (выказнікавыя) сказы: пэўна-асабовыя, абагульнена-асабовыя, няпэўна-асабовыя, безасабовыя, інфінітыўныя. Праблема вылучэння абагульнена-асабовых сказаў. Размежаванне безасабовых і інфінітыўных сказаў у рэчышчы традыцыйнага беларускага сінтаксісу. Субстантыўныя (дзейнікавыя) сказы: намінатыўныя, назыўныя, вакатыўныя, генітыўныя, канструкцыі з “назоўным уяўлення”.

Семантычная арганізацыя аднасастаўных сказаў. Кваліфікацыі аднасастаўных сказаў у рэчышчы семантычнага падыходу. Праблема вылучэння аднасастаўных сказаў (канцэпцыя “аб прынцыповай двухсастаўнасці сказа”). Аднасастаўныя сказы як вынік камунікатыўнай рэалізацыі двухсастаўнай мадэлі.

Ускладненне простага сказа як спосаб пашырэння яго структурнай схемы. Ускладненне і катэгорыя прэдыкатыўнасці. Семантычныя і сінтаксічныя аспекты ўскладненых сказаў. Інтанацыйнае афармленне ўскладнення.

Сказы з аднароднымі членамі: арганізацыя, семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі аднароднага рада, функцыі аднародных членаў сказа. Сінтаксічная сувязь паміж аднароднымі членамі: адкрытая /

закрытая, злучнікавая / бяззлучнікавая. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа.

Сказы з адасобленымі членамі сказа. Умовы адасаблення членаў сказа: семантычныя, граматычныя, камунікатыўныя. Сінтаксічная сувязь пры адасабленні: паўпрэдыкатыўная, паясняльная. Тыпы адасобленых кампанентаў.

Сказы з параўнальнымі зваротамі. Структура, тыпы, значэнне, функцыі параўнальных зваротаў у сказе.

Сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, іх структура і функцыі. Размежаванне пабочных і ўстаўных канструкцый. Агульнае і адрознае паміж пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі.

Сказы са звароткам. Структура, функцыі і значэнне звароткa ў сказе.

Сказы з мадальнымі часціцамі і выклічнікамі. Значэнне і функцыі сцвярджальных, адмоўных, пытальных і эмацыянальных слоў у сказе.

Камунікатыўная арганізацыя простага сказа. Сказ і выказванне. Актуальнае чляненне выказвання. Кампаненты актуальнага члянення. Сродкі актуальнага члянення і актуалізацыі выказвання (парадак слоў, інтанацыя, лагічны націск, службовыя словы і інш.). Парадак слоў і актуальнае чляненне. Прамы і адваротны (інверсійны) парадак размяшчэння кампанентаў у выказванні. Спосабы выражэння тэмы і рэмы ў простым сказе. Камунікатыўная парадыгма сказа. Асноўныя камунікатыўна-сінтаксічныя тыпы выказванняў у беларускай мове. Тыпалогія выказванняў: нейтральныя / экспрэсіўныя, расчлянёныя / нерасчлянёныя (з нулявой тэмай), сінтагматычна незалежныя / сінтагматычна залежныя (абумоўленыя).

Суадносіны камунікатыўнага і фармальна-сінтаксічнага члянення выказвання.

## Складаны сказ

Паняцце складанага сказа. Семантычная, фармальная і камунікатыўная арганізацыя складанага сказа. Дыферэнцыяльныя рысы складанага сказа (поліпрэдыкатыўнасць, поліпрапазіцыйнасць і інш.). Ізамарфізм складанага сказа і словазлучэння. Граматычнае значэнне і граматычная форма складаных сказаў. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж прэдыкатыўнымі часткамі складаных сказаў, сродкі іх выражэння (інтанацыя, злучнікі і злучальныя словы).

Прынцыпы класіфікацыі складаных сказаў. Асноўныя падыходы да класіфікацыі складаных сказаў. Структурна-семантычны падыход: злучнікавыя сказы: складаназлучаныя, складаназалежныя; бяззлучнікавыя сказы. Падыход “ад зместу да формы” (канцэпцыя А. Я. Міхневіча): складаназлучаныя сказы: злучнікавыя, бяззлучнікавыя; складаназалежныя сказы: злучнікавыя, бяззлучнікавыя. Праблема вылучэння бяззлучнікавых сказаў.

Паняцце складаназлучанага сказа. Дыферэнцыяльныя прыметы складаназлучаных сказаў: адносная аўтаномнасць, адносная раўнапраўнасць прэдыкатыўных частак, наяўнасць злучальных сродкаў сувязі. Складаназлучаныя сказы са спалучальнымі, размеркавальнымі, супраціўнымі, далучальнымі злучнікамі. Складаназлучаныя сказы аднароднага і неаднароднага складу, адкрытай і закрытай структуры. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж прэдыкатыўнымі часткамі складаназлучаных сказаў і спосабы іх выражэння. Шматкампанентныя складаназлучаныя сказы. Складаназлучаныя сказы згрупіраванай і незгрупіраванай будовы.

Паняцце складаназалежнага сказа. Дыферэнцыяльныя прыметы складаназалежных сказаў: характар сінтаксічнай сувязі – гіпатаксіс, іерархізаванасць будовы складаназалежных сказаў, наяўнасць падпарадкавальных сродкаў сувязі (злучнікаў і злучальных слоў). Падыходы да класіфікацыі складаназалежных сказаў: функцыянальны, марфалагічны, фармальны, структурна-семантычны.

Функцыянальны падыход да класіфікацыі складаназалежных сказаў. Складаназалежныя сказы з даданымі дзейнікавымі, выказнікавымі, дапаўняльнымі, азначальнымі і акалічнаснымі часткамі. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж галоўнай і даданай часткамі складаназалежных сказаў і спосабы іх выражэння.

Структурна-семантычны падыход да класіфікацыі складаназалежных сказаў. Тып складаназалежных сказаў паводле структуры: складаназалежныя сказы расчлянёнай, нерасчлянёнай, кантамінаванай структуры. Асноўныя сродкі сувязі: падпарадкавальныя злучнікі, злучальныя словы (рэляты), указальныя словы (карэляты), апорныя словы. Праблема размежавання злучнікаў і злучальных слоў у складаназалежных сказах.

Складаназалежныя сказы нерасчлянёнай (прыслоўнай) структуры, асаблівасці іх арганізацыі.

Структурна-семантычныя тыпы складаназалежных сказаў нерасчлянёнай структуры: прысубстантыўна-атрыбутыўныя, тлумачальна-аб’ектныя, прыкампаратыўна-аб’ектныя, прызайменнікава-суадносныя.

Складаназалежныя сказы расчлянёнай (прысастаўнай, прыфразавай) структуры, асаблівасці іх арганізацыі. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж прэдыкатыўнымі часткамі такіх сказаў, спосабы іх выражэння. Тыпалогія складаназалежных сказаў расчлянёнай структуры.

Складаназалежныя сказы кантамінаванай будовы, асаблівасці іх арганізацыі.

Шматкампанентныя складаназалежныя сказы. Тыпы падпарадкавання на ўзроўні складаназалежных сказаў з некалькімі даданымі часткамі: паслядоўнае падпарадкаванне; сузалежнае падпарадкаванне: аднароднае і неаднароднае; камбінацыя розных тыпаў падпарадкавання.

Паняцце бяззлучнікавага складанага сказа. Дыферэнцыяльныя прыметы бяззлучнікавых сказаў: дыфузнасць, размытасць семантыкі, недастатковая дыферэнцыраванасць значэнняў бяззлучнікавых сказаў; адсутнасць злучальных сродкаў сувязі. Бяззлучнікавыя сказы аднароднага і неаднароднага складу, адкрытай і закрытай структуры. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж прэдыкатыўнымі часткамі бяззлучнікавых сказаў і спосабы іх выражэння. Шматкампанентныя бяззлучнікавыя сказы. Бяззлучнікавыя сказы згрупіраванай і незгрупіраванай будовы.

Камбінаваныя складаныя сказы. Дыферэнцыяльныя прыметы камбінаваных складаных сказаў: наяўнасць розных відаў сувязі; больш за два ўзроўні члянення; згрупаванасць структуры. Паняцце генеральнай сувязі. Разнавіднасці камбінаваных сказаў, іх структура і значэнне. Сувязь прэдыкатыўных частак у камбінаваных складаных сказах. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж часткамі камбінаваных сказаў і спосабы іх выражэння.

## Складанае сінтаксічнае цэлае (ССЦ)

Складанае сінтаксічнае цэлае (звышфразавае адзінства, празаічная страфа) як мінімальная адзінка тэксту. Асноўныя крытэрыі вылучэння ССЦ: лагічны, семантычны, граматычны. Паняцце мікратэмы. ССЦ і абзац. Суадносіны ССЦ і абзаца. Асноўныя функцыі абзаца.

Сродкі міжфразавай сувязі на ўзроўні ССЦ: уласна лексічныя, лексіка-граматычныя, граматычныя. Віды сувязі ў ССЦ: ланцужковая, паралельная, далучальная, змешаная. Тыпы рэматычнай дамінанты ССЦ: прадметная, якасная, статальная, акцыянальная, статальна-дынамічная, імпрэсіўная, сінкрэтычная.

Семантычная і структурная арганізацыя складанага сінтаксічнага цэлага.

Камунікатыўная арганізацыя складанага сінтаксічнага цэлага. Тэма-рэматычная структура складанага сінтаксічнага цэлага. Тыпы тэма-рэматычных ланцужкоў: простая лінейная паслядоўнасць, паслядоўнасць са скразной тэмай, паслядоўнасць з вытворнымі тэмамі, паслядоўнасць з расшчэпленай тэмай.

## Тэкст

Тэкст як сінтаксічная адзінка. Паняцце тэксту і дыскýрсу. Падыходы да даследавання граматычнай прыроды тэксту: структурны (граматычны), семантычны, стылістычны, камунікатыўны, псіхалінгвістычны, семіятычны, прагматычны, кагнітыўны і інш. Катэгорыі тэксту. Структура тэксту, тыпы сувязі ў ім, сродкі яе рэалізацыі. Асаблівасці арганізацыі тэкстаў розных стыляў.

Функцыянальна-сэнсавая тыпалогія тэкстаў: апавяданне, апісанне, разважанне. Семантыка-сінтаксічная адметнасць іх арганізацыі.

## Чужая мова

Чужая мова, яе віды (простая, ускосная і няўласна-простая) і спосабы ўвядзення ў кантэкст. Сінтаксічныя асаблівасці разнавіднасцей чужой мовы. Чужая мова і словы аўтара, сувязь і ўзаемаадносіны паміж імі.

Рэпліка, маналог, дыялог, палілог, цытата, іх арганізацыя, функцыі і стылістычная роля.

## Пунктуацыя

Прадмет і задачы пунктуацыі. Пунктуацыя як графічны сродак пісьмовай мовы. Значэнне пунктуацыі.

Асновы сучаснай пунктуацыі. Пунктуацыя і граматычная будова сказа. Пунктуацыя і інтанацыйнае афармленне сказа.

Нарматыўнасць сучаснай пунктуацыі. Прынцыпы беларускай пунктуацыі. Пунктуацыйныя варыянты і іх значэнне.

Класіфікацыя знакаў прыпынку. Раздзяляльныя і выдзяляльныя знакі прыпынку. Агульная характарыстыка знакаў прыпынку і асноўных правіл іх пастаноўкі ў пісьмовым тэксце.

# ЛІТАРАТУРА

## Асноўная


1. *Беларуская* граматыка: У 2 ч.– Мінск: Навука і тэхніка. – Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск, 1985. – 431 с.; Ч. 2. Сінтаксіс. – 1986. – 327 с.
2. Беларуская мова: хрэстаматыя / З.І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск: ПУП Изд-во "Юнипресс", 2005. – 592 с.
3. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1994. – 654 с.
4. *Бурак, Л.І.* Даведнік па пунктуацыі беларускай мовы / Л.І. Бурак. – Мінск: Выдавецтва БДУ, 1980. – 208 с.
5. *Бурак, Л.І.* Сучасная беларуская мова. Арфаграфія і пунктуацыя. Практыкум / Л.І. Бурак, І.Л. Бурак. – Мінск: Універсітэцкае, 1993. – 247 с.
6. *Бурак, Л.І.* Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс. Пунктуацыя / Л.І. Бурак. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 319 с.
7. *Бурак, Л.І.* Сучасная беларуская мова: Практычныя заняткі / Л.І. Бурак, В.П. Красней, У.М. Лазоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1989. – 334 с.
8. *Выгонная, Л.Ц.* Інтанацыя. Націск. Арфаэпія / Л.Ц. Выгонная. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 215 с.
9. Граматыка беларускай мовы. У 2 т. / Рэдактары К.К. Атраховіч (Крапіва), М.Г. Булахаў, П.П. Шуба. – Мінск: Навука і тэхніка. – Т. І. Марфалогія, 1962, -- 680 с.; Т. ІІ. Сінтаксіс, 1966. – 756 с.
10. Зборнік тэкстаў для лінгвістычнага аналізу: для студэнтаў філал. фак. / аўт.-склад.: З.І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2005. – 259 с.
11. Кароткая граматыка беларускай мовы. У 2 ч. / навук. рэд. А.А. Лукашанец. Ч. 1. Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія. – Мінск: Беларуская навука, 2007. – 351 с.; Ч. 2. Сінтаксіс. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 240 с.
12. *Крывіцкі, А.А.* Фанетыка беларускай мовы / А.А. Крывіцкі, А.І. Падлужны. – Мінск: Вышэйшая школа, 1984. – 268 с.
13. Лексікалогія сучаснай беларускай мовы; пад рэд. А.Я.Баханькова. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 463 с.
14. *Лепешаў, І.Я.* Фразеалогія сучаснай беларускай мовы / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Вышэйшая школа, 1998. – 271 с.
15. *Лукашанец, А.А.* Словаўтварэнне і граматыка / А.А. Лукашанец. – Мінск: НАН Беларусі, 2001. – 251 с.
16. *Малажай, Г.М.* Лінгвістычны аналіз тэксту / Г.М. Малажай. – Мінск: Вышэйшая школа, 1992. – 365 с.
17. *Маршэўская, В.В.* Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс / В.В. Маршэўская. – Гродна: ГрДУ, 2008. – 159 с.

18. *Плотнікаў, Б.А.* Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. – 672 с.
19. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мінск: Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі, 2008. – 144 с.
20. *Рамза, Т.Р.* Сінтаксіс. Просты сказ: Курс лекцый / Т.Р. Рамза. – Мінск: БДУ, 2002. – 117 с.
21. *Рамза, Т.Р.* Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: Вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; Пад агул. рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск: БДУ, 2003. – 202 с.
22. *Русак, В.П.* Марфаналогія сучаснай беларускай мовы / В.П. Русак. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 316 с.
23. Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія: Вучэбны дапаможнік / Н.В. Гаўрош [і інш.]; пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мінск: Выд. Ул.М. Скакун, 1997. – 288 с.
24. Сучасная беларуская мова. Уводзіны. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія. Фразеаграфія / Я.М. Камароўскі [і інш.]. – Мінск: Вышэйшая школа, 1995. – 334 с.
25. *Сямешка, Л.І.* Беларуская мова. Уводзіны ў навуку аб мове. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія: Вучэбны дапаможнік / Л.І. Сямешка. – Мінск: Сучаснае слова, 1999. – 224 с.
26. *Сямешка, Л.І.* Курс беларускай мовы / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1996. – 654 с.
27. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / рэд. А.І. Падлужны. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 335 с.
28. *Чалюк, Н.М.* Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М. Чалюк. – Мінск: ТэтраСістэмс, 2004. – 81 с.
29. *Шакун, Л.М.* Гісторыя беларускага мовазнаўства / Л.М. Шакун. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 271 с.
30. *Шакун, Л.М.* Словаўтварэнне / Л.М. Шакун. – Мінск: Вышэйшая школа, 1978. – 128 с.
31. *Шуба, П.П.* Сучасная беларуская мова. Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.
32. *Яўневіч, М.С.* Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М.С. Яўневіч, П.У. Сцяцко. – Мінск: Аверсэў, 2006. – 286 с.

## Дадатковая

1. *Антанюк, Л.А.* Станавыя значэнні сумеснасці і ўзаемнасці ў беларускай мове / Л.А. Антанюк. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 127 с.
2. *Антанюк, Л.А.* Сучасная беларуская тэрміналогія / Л.А. Антанюк. – Мінск: Анонс, 1995. – 40 с.
3. *Булахаў, М.Г.* Прыметнік у беларускай мове / М.Г. Булахаў. – Мінск: Навука і

тэхніка, 1964. – 199 с.
4. *Васілеўскі, М.С.* Прадуктыўныя тыпы дзеясловаў у сучаснай беларускай мове / М.С. Васілеўскі. – Мінск: Выдавецтва БДУ, 1970. – 110 с.
5. *Вярхоў, П.В.* Лічэбнік у беларускай мове (параўнальна з рускай і ўкраінскай мовамі) / П.В. Вярхоў. – Мінск: Выдавецтва БДУ, 1961. – 36 с.
6. *Дабрыян, М.В.* Сучасная беларуская мова: Лабараторныя работы: [Для філал. фак. ун-таў] / М.В. Дабрыян, Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 145 с.
7. *Жыдовіч, М.А.* Назоўнік у беларускай мове. Ч.1. Адзіночны лік / М.А. Жыдовіч. – Мінск: Выдавецтва БДУ, 1969. – 320 с.
8. *Івашуціч, Я.М.* Націск у дзеяслоўных формах сучаснай беларускай мовы / Я.М. Івашуціч. – Мінск: Вышэйшая школа, 1981. – 96 с.
9. *Клюсаў, Г.Н.* Сучасная беларуская пунктуацыя. / Г.Н. Клюсаў, А.Л. Юрэвіч, А.Л. Мінск: Вышэйшая школа, 1972, – 280 с.
10. *Крывіцкі, А.А.* Практыкум па фанетыцы беларускай мовы: [Для ВНУ] / А.А. Крывіцкі, А.І. Падлужны. – Мінск, 1989. – 220 с.
11. *Лепешаў, І.Я.* Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік / І.Я. Лепешаў. – Гродна: ГрДУ, 2002. – 207 с.
12. *Малажай, Г.М.* Лабараторныя працы па сучаснай беларускай мове: Вучэбны дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ. - 2-е выд., дапрац. і дап / Г.М. Малажай, Т.М. Кананенка. – Мінск: Вышэйшая школа, 1999. – 300 с.
13. *Малажай, Г. М.* Сучасная беларуская мова: Слова. Перыфраза. Фразеалагізм: Вучэбны дапаможнік / Г.М. Малажай. – Мінск: Вышэйшая школа, 1992. – 238 с.
14. *Міхневіч, А.Я.* Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы / А.Я. Міхневіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 264 с.
15. *Міхневіч, А.Я.* Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў беларускай мове / А.Я. Міхневіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1965. – 114 с.
16. *Наркевіч, А.І.* Назоўнік. Граматычныя катэгорыі і формы / А.І. Наркевіч. – Мінск: Выдавецтва БДУ, 1976. – 248 с.
17. *Рагаўцоў, В. І.* Дыскусійныя пытанні сінтаксісу беларускай і рускай моў: Вучэбны дапаможнік для філалагічных факультэтаў ВНУ / Магілёўскі дзярж. ун-т імя А.А. Куляшова / В.І. Рагаўцоў. – Магілеў: Выд-ва Магілеўскага дзярж. ун-та ім. А.А. Куляшова, 2000. – 164 с.
18. *Рамза, Т.Р.* Безасабовыя сказы / Т.Р. Рамза. – Мінск, 1998. – 71 с.
19. Сучасная беларуская мова: лексікалогія, фразеалогія, фанетыка, арфаэпія, графіка, арфаграфія: Кантрольныя працы / ГрДУ. – Гродна : ГрДУ, 1994. – 45 с.
20. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Г.У. Арашонкава [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 1999. – 175 с.
21. *Шкраба, І.Р.* Варыянтнасць у сучаснай беларускай мове / І.Р. Шкраба. – Мінск:

ТАА "Асар", 2004. – 240 с.
22. *Янкоўскі, Ф.М.* Беларускае літаратурнае вымаўленне / Ф.М. Янкоўскі. – Мінск: Народная асвета, 1976. – 91 с.
23. *Янкоўскі, Ф.М.* Беларуская фразеалогія / Ф.М. Янкоўскі. – Мінск: Народная асвета, 1981. – 79 с.

## Слоўнікі

1. *Арашонкава, Г.У.* Кіраванне ў беларускай і рускай мовах. Слоўнік-даведнік / Г.У. Арашонкава, В.П. Лемцюгова. – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – 303 с.
2. *Бардовіч, А.М.* Марфемны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, Л.М. Шакун. – Мінск: Вышэйшая школа, 1989. – 716 с.
3. *Бардовіч, А.М.* Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, М.М. Круталевіч, А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларуская навука, 2000. – 413 с.
4. Беларускі арфаграфічны слоўнік / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. Л.П. Кунцэвіч, І.У. Кандраценя; пад рэд. А.А. Лукашанца. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 695 с.
5. *Бірыла, М.В.* Слоўнік націску ў беларускай мове / М.В. Бірыла. – Мінск: Народная асвета, 1992. – 144 с.
6. *Булыка, А.М.* Слоўнік іншамоўных слоў: актуальная лексіка / А.М. Булыка. – Мінск: Попурри, 2005. – 336 с.
7. Граматычны слоўнік дзеяслова / НАН Беларусі. Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; Навук. рэд.: А.І. Падлужны; Уклад. В.П. Русак, Л. Ліхадзіеўская. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – 1252 с.
8. Граматычны слоўнік назоўніка / НАН Беларусі. Ін-т мовы і літаратуры імя Якуба Коласа І Янкі Купалы; Навук. рэд. А.Я. Міхневіч, В.П. Русак; Уклад.: Г.У. Арашонкава, Н.А. Чабатар, А.М. Астапчук, В.І. Уласевіч. – Мінск : Беларуская навука, 2008. – 1379 с.
9. *Завальнюк, У.М.* Слоўнік сучаснай беларускай мовы / У.М. Завальнюк, М.Р. Прыгодзіч, В.К. Раманцэвіч / пад агул. рэд. У.М. Завальнюка. – Мінск, Народная асвета, 2009. – 399 с.
10. *Клышка, М.К.* Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К. Клышка. – Мінск: Вышэйшая школа, 1993. – 445 с.
11. *Лазоўскі, У.М.* Слоўнік антонімаў беларускай мовы: канкрэтныя выпадкі ўжывання / У.М. Лазоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1994. – 293 с.
12. *Лепешаў, І.Я.* Слоўнік беларускіх прыказак: Даведнік / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцэвіч. – Мінск: БелЭН, 1996. – 352 с.
13. *Лепешаў, І.Я.* Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: у 2 т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – Т. 1. – 672 с.; Т. 2 – 704 с.
14. *Лепешаў, І.Я.* Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск:

БелЭН, 2004. – 448 с.
15. *Прыгодзіч, М.Р.* Пішам без памылак: асобна, разам, праз дэфіс / М.Р. Прыгодзіч. – Мінск: Парадокс, 2002. – 256 с.
16. Слоўнік асабовых уласных імён / НАН Беларусі. Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа; Навуковы рэдактар А.А. Лукашанец; Уклад. М.Р. Суднік. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск: Беларуская навука, 2005. – 176 с.
17. Слоўнік беларускай мовы. Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1987. – 902 с.
18. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / Аўт.-склад. М.К.Клышка. — Мн.: ПУП “Радыёла-плюс”, 2005. – 672 с.
19. *Старычонак, В.Дз.* Слоўнік амонімаў беларускай мовы / В.Дз. Старычонак. – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – 255 с.
20. *Сцяцко, П.У.* Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П.У. Сцяцко, М.Ф. Гуліцкі, Л.А. Антанюк. – Мінск: Вышэйшая школа, 1990. – 222 с.
21. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1999. – 784 с.
22. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / пад агульн. рэд. К.К. Атраховіча. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі. Т. 1, 1977. – 608 с.; Т. 2, 1978. – 768 с.; Т. 3, 1979. – 672 с.; Т. 4, 1980. – 767 с.; Т. 5, кн. 1, 1983. – 663 с.; Т. 5, кн. 2, 1984. – 608 с.
23. *Шкраба, І.Р.* Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі / І.Р. Шкраба. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 320 с.

Вучэбнае выданне

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## Тыпавая вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях

**1-21 05 01 "Беларуская філалогія (па напрамках)",**
**1-21 05 02 "Руская філалогія (па напрамках)",**
**1-21 05 04 "Славянская філалогія",**
**1-21 05 05 "Класічная філалогія",**
**1-21 05 06 "Рамана-германская філалогія"**

С к л а д а л ь н і к і

**Бадзевіч** Зінаіда Іванаўна
**Важнік** Сяргей Аляксандравіч
**Чахоўскі** Георгій Канстанцінавіч

У аўтарскай рэдакцыі

Адказны за выпуск *Г. К. Чахоўскі*

Падпісана да друку 19.10.2010. Фармат 60x84/16. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 2,79. Ул.-выд. арк. 2,35. Тыраж 100 экз. Заказ 34

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
ЛВ № 02330/0494425 от 08.04.2009
Пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка
на капіравальна-множыльнай тэхніцы
філалагічнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
Вул. К. Маркса, 31, 220030, Мінск